СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 8.20, 16.17, 7.57;
Віцебск — 8.16, 16.01, 7.45;
Магілёў — 8.09, 16.07, 7.58;
Гомель — 7.59, 16.11, 8.12;
Гродна — 8.34, 16.34, 8.00;
Брэст — 8.27, 16.42, 8.15.
МЕСЯЦ:
Першая чвэрць 13 студзеня.
ІМЯНІНЫ:
Сільвестра, Серафіма, Дамаслава, Паўла

ЗВЯЗДА

15 студзеня 1992 г.
серада, № 8 (21786)
● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 40 кап.

РОЗГАЛАС

ЦЭНЫ НА РЫНКАХ (у рублях)

Рыга. Бульба — 7—8, капуста—3—4, морква—5—8, буракі—5—8, смятана—40—100, тварог—40—50, малако — 8—12, ялавічына — 40—50, свініна — 50—130.

Талін. Бульба—8—10, капуста—4, морква—5, смятана — няма, тварог—няма, малако—няма, ялавічына—няма, свініна —80—100.

Санкт-Пецярбург (Кузнечны рынак). Бульба — 10—25, капуста — 10—15, морква—10—15, буракі—10—20, смятана — 150, тварог—40, малако—няма, ялавічына — 150—250, свініна—150—350.

Масква. Бульба — 10—20, капуста—8, морква — 20, буракі—7, смятана—60, тварог—60, малако — 10, ялавічына — 150—200, свініна — 140—200.

Мінск (Камароўскі рынак). Бульба — 6—8, капуста — 2—5, буракі—2—5, смятана—60, тварог—няма, масла—90, свініна —60—110, ялавічына—50—60, цяляціна — 80—90, бараніна—70—80, яйкі—25, яблыкі — 10—25, мандарыны — 30—35, мёд —160—180, піва (1 бутэлька)—10, цыгарэты («Арбіта»), «Апал» — 10. 14 студзеня на Камароўскім рынку 75-рублёвы аркуш купонаў прадаваўся за 130 рублёў, 200-рублёвы — за 200—220 рублёў.

Вільнюс. Бульба—5, капуста—4, морква—7—8, буракі — 7—8, смятана—няма, тварог—няма, малако—няма, ялавічына —80—90, свініна—80—90.

«Агенцтва РІД».

ПЕНСІЯНЕРЫ РАЗЫШЛІСЯ

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (У. Пернікаў). Нейкая незразумелая агрэсіўнасць з'явілася ў некаторых ветэранаў. Толькі ў адзін дзень 7 студзеня яны ўчынілі чатыры жорсткія бойкі. Ды з кім? Са сваімі блізкімі родзічамі.

Так, раней судзімы 77-гадовы Ф. Бялоў з вёскі Прыбыткі Гомельскага раёна саданув нажом у жывот свайму 17-гадоваму ўнуку. Тое самае ўчыніў і жыхар Светлагорска В. Папоў з зяцем М. Салдаценкам у кватэры апошняга. А Ф. Салавей з вёскі Мармовічы гэтага раёна парэзаў сыну твар і шыю, але атрымаў ад яго ўдар малатком па галаве і трапіў у бальніцу.

«Арыгінальна» завяршыў спрэчку з жонкай і А. Любанец з вёскі Віць Хойніцкага раёна. Ён выліў 10 літраў бензіну на падлогу сваёй хаты і чыркнуў запалкай. У выніку жонка са шматлікімі апёкамі змешчана ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Дык што ж здарылася з пенсіянерамі? Аказваецца, яны сустракалі Каляды і добра перабралі спіртнога.

МІР ВАШАМУ ДОМУ!

«Мир и дом»—так называецца новая газета, якая толькі што з'явілася ў кіёсках «Саюздруку» Наваполацка.

Калі прааналізаваць змест гэтага выдання, то можна сказаць, што маем мы газету-громаадвод. Чытач сёння сыты ў большасці сваёй палітычнай хронікай, а тут —нешта падобнае на дамашняга доктара ў чэхаўскім разуменні, калі ў сакваяжы, акрамя стэтаскопа, і свецкая хроніка, і свежы анекдот, і крыху прыгод, вершы дарослыя і вершы дзіцячыя.

10 тысяч — тыраж першага нумара, у бліжэйшых планах — 100 тысяч. Выданне распаўсюджваецца таксама ў Віцебску, Мінску, Бранску, Смаленску. А ў Грозным, мяркуецца, будзе адкрыты ўласны карпункт, адной з задач якога стане выпуск укладыша па мясцовай тэматыцы.

БЕРАГУЦЬ ГОНАР МАРКІ

Аказваецца, мінскі гадзіннікавы завод «Прамень» моцны ў вытворчасці не толькі «Перабудоў», але і кварцавых гадзіннікаў з сімволікай Беларусі.

На іх цыферблаце «Пагоня» (з адзнакай: «старажытны сімвал Беларусі XIII — XVIII стст.» Чаму ж без дабаўлення «Дзяржаўны герб Рэспублікі»?) на фоне карты Беларусі. Дарэчы, па абрысах яна больш нагадвае карту Вялікага Княства Літоўскага. І пад усёй гэтай сімволікай — красамоўны надпіс «Зроблена ў СССР». Можа, мы памыляемся, прымаючы Мінск за цэнтр Садружнасці, а не СССР?

Дарэчы, на гадзінніках з адлюстраваннем гістарычнага герба Мінска — таксама стары адрас.

БелаПАН.

АКІЯН НЕ ПЕРАШКОДА

СМАРГОНЬ. Сяброў у асобе школьнікаў з амерыканскага горада Амерыкан Форт знайшлі члены КІДа пры першай гарадской школе Смаргоні. Спачатку была толькі перапіска, а нядаўна заакіянскія госці на чале з выкладчыкам геаграфіі М. Мауэрам наведалі Гродзеншчыну. У будучым годзе плануецца візіт у адказ у Амерыку.

Арлоўская, 18

Мінск. Вуліца Арлоўская, 18, салон-атэлье «Практычная мода». Гэты адрас вядомы ўжо многім мінчанам, і ў прыватнасці, мінчанкам, якія жадаюць не столькі стаць прафесіянальнымі манекеншчыцамі, колькі навучыцца быць проста прывабнымі, пазбавіцца ад розных комплексаў і недахопаў. А зрабіць гэта можна ўсяго за тры месяцы. Спяшайцеся наведаць салон!

ЧП на МАзе. Ахвяр няма

З-за пажару спыніўся галоўны канвеер завода-гіганта, які, дарэчы, праз некаторы час зноў запрацаваў. Прычына пажару і ўрон устанаўліваюцца.

Яшчэ адна партыя

135 беларускіх дзяцей накіраваны на аздараўленне ў Саксонію, федэральную зямлю ФРГ, самалётам «Люфтгензы». Яны адпачнуць у санаторыях і сем'ях. У мінулы панядзелак «Аэрафлот» перавёз у Берлін яшчэ адну групу дзяцей. Аздараўленне і тых і другіх арганізавана Беларускім дабрачынным фондам «Дзецям Чарнобыля».

Дадумаліся...

ДОБРУШ. Мясцовыя гандлёвыя работнікі са згоды ўлад зрабілі пакупнікам сюрпрыз, які выклікаў неадназначную ацэнку ў насельніцтва. Тут па камерцыйнай цане — 60 рублёў за бутэльку — арганізавалі продаж гарэлкі. Без купонаў і талонаў. Адзін з магазінаў, якому выпаў такі «гонар», называецца «Дзіцячы свет». Прывучайся, дзятва, да спіртнога!

Рада ведае — рэферэндум будзе

13 студзеня на пасяджэнні каардынацыйнай рады ініцыятыўнай групы па правядзенню ўсебеларускага рэферэндуму ўдакладнены тэкст заявы для рэгістрацыі ў Цэнтральнай выбарчай камісіі пытання, што выносіцца на рэферэндум. Дарэчы, колькасць членаў ініцыятыўнай групы па ўсёй рэспубліцы — прыкладна 500 чалавек.

З НЕАФІЦЫЯЛЬНЫХ КРЫНІЦ ——

АД ШПАЛЕРАЎ ДА ТАЛЕРАЎ

У маім годзе—рабі як я!

Усе краіны СНД збіраюцца ў будучым увесці свае ўласныя валюты. Адны дзяржавы былога СССР яшчэ толькі мараць аб гэтым, другія — вось-вось пачнуць расплачвацца сваімі грашовымі знакамі. Але ёсць адна характэрная асаблівасць — новыя грошы друкуюцца на замежнай паперы ў краінах Захаду. На гэтым фоне вельмі цікавы наступны факт. На адной з папяровых фабрык Магілёўскай вобласці аўтарытэтная камісія з Мінска вывучае магчымасці наладжвання вытворчасці ўласнай грашовай паперы. Дарэчы, тэхналогія вырабу паперы для беларускіх талераў не вельмі адрозніваецца ад вытворчасці шпалераў (выпуск якіх нядаўна з поспехам асвоіла вышэйназваная фабрыка). Хутка пачнуцца першыя спробы, а там, магчыма, Беларусь стане першай з краін СНД, грошы якой будуць выраблены з уласнай паперы. А для дзялкоў «ценявой эканомікі» паведамляем, што месца дыслакацыі папяровай фабрыкі рэдакцыі вядома, і мы гатовы расказаць аб ім за адпаведнае ўзнагароджанне (ніжэй рыначных цэн).

«НАМ ЦЕСНА Ў СТАРЫХ СЦЕНАХ»

Цяжка ахарактарызаваць адным словам час, у які мы жывём. Сказаць, што ён складаны—бадай, нічога не сказаць. Здаецца, што ўсе людзі кінуліся шукаць доўгі рубель, выгаднае месца работы і прылаўкі, на якія яшчэ калі-нікалі нешта выкідваюць. Такое ўражанне, што камерцыя і бізнес запаланілі не толькі розум, але і душы людзей. Цікава, ці не апусцелі зусім чытальныя залы нашай галоўнай бібліятэкі рэспублікі? З такім пытаннем наш карэспандэнт звярнулася да загадчыцы аддзела абслугоўвання Дзяржаўнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, якая нядаўна насіла імя У. І. Леніна, Ларысы Іванаўны ПРАДКА:

— Не, колькасць чытачоў не зменшылася. Наадварот, чытачоў пабольшала.

— А з чым гэта звязана?

— Мы лічым, што людзей да нас вабяць кніжныя фонды бібліятэкі. Яны багатыя і універсальныя. У нашых кнігасховішчах можна знайсці розную літаратуру па ўсіх галінах ведаў. Змяніўся і наш падыход да чытача. Зараз мы запісваем і абслугоўваем усіх жадаючых. Студэнтаў — з першага курса, між тым як раней—толькі пачынаючы з трэцяга. Школьнікаў і ліцэістаў. Абслугоўваем часова і доўгатэрмінова. Калі будзе новы будынак, мяркуем адкрыць залу для юнацтва. Бо дзяцей і падлеткаў да нас ідзе вельмі шмат, і іх цікавіць спецыфічная літаратура.

— У вас жа некалькі навуковых залаў...

— Так. Але ў апошнія гады навуковыя супрацоўнікі і спецыялісты туды ходзяць радзей. Гэта звязана з тымі працэсамі, што праходзяць у нашай краіне. Закрываюцца кафедры грамадскіх навук і нават цэлыя інстытуты. Таму многім навуковым супрацоўнікам прыходзіцца мяняць работу, нават погляды. Некаторыя з тых, хто наведваў залу тэхнічных навук, заняліся камерцыйнай дзейнасцю. Зараз іх цікавіць іншая літаратура. Адбываецца ўзаемапранікненне навук, пашырэнне інтарэсаў. Галіновыя залы практычна аджылі сваё.

— Якая літаратура найбольш цікавіць вашых чытачоў?

— Вельмі розная. Але часцей бяруць эканамічную, пра рынак, біржы, маркетынг. Мы разумеем, што людзям не заўсёды хапае часу паспець усё прачытаць у зале. У такіх выключных выпадках мы выдаём кнігі на суткі, на святочныя дні —на час, калі не працуе бібліятэка, — за плату: 1 рубель за суткі. Дарэчы, ёсць у нас і іншыя дадатковыя платныя паслугі.

— Калі ласка, раскажыце пра іх больш падрабязна.

— Іх шмат. Назаву некаторыя. Ёсць у нас служба прыёму заказаў па тэлефоне. Каштуе такая паслуга 20 капеек. Але колькі часу эканоміцца! З 9 да 19 гадзін па тэлефоне 27-89-14 прымаюцца заказы на патрэбную кнігу. Праз тры гадзіны чалавек можа прыходзіць у чытальную залу і працаваць. У нас можна таксама зняць ксеракопію старонак артыкулаў, дакументаў з фондаў бібліятэкі. Выдаём дакументы для фота- і кінаэдымак. Робім на ферамагнітную стужку заказчыка гуказапісы з фондаў бібліятэкі. У даведачна-інфармацыйным аддзеле за невялікую плату складуць бібліяграфічны спіс з анатацыяй або без яе, аформяць спіс літаратуры да навуковай працы, зробяць аналітычны агляд па пытаннях мастацтва. Мяркуем пераздымаць выкрайкі з замежных часопісаў. Праводзім экскурсіі па бібліятэцы. У апошнія аўторак і сераду кожнага месяца прадаём выданні, якія нашай бібліятэцы і іншым не патрэбны. Спісваем толькі тое, што не мае попыту. У выніку—яшчэ пяць тысяч рублёў у год.

— Цікавяцца зараз творамі класікаў марксізму-ленінізму?

— Чытаюць. Праўда, некаторыя вышукваюць там контраргументы. У адным з перыядычных выданняў напісалі, што ў нашай бібліятэцы апусцелі паліцы з тамамі Маркса і Леніна. Не, не апусцелі. Мы толькі зменшылі колькасць экземпляраў. Фонды нашы растуць хутка. Шмат праблем з іх размяшчэннем. Нам тут вельмі цесна. Старыя тоўстыя сцены не дазваляюць хоць колькі-небудзь механізаваць нашу працу. Не змаглі іх прабіць, каб наладзіць пнеўмапошту. А гэта значна паскорыла б выкананне заказаў. Але некаторыя працэсы ў нас ужо аўтаматызаваны. Выкарыстоўваем камп'ютэры. Мы марым пра новы будынак для нашай бібліятэкі. Быў конкурс на яго праект. Выбралі лепшы. Там прадугледжана ўсё: мноства залаў — і для інвалідаў, і для індывідуальнай работы з пішучай машынкай і лічыльнай тэхнікай. Камфортнасць усюды. Спецыяльны ліфт і асобны ўваход для інвалідаў. Буфеты, каб людзі не жавалі бутэрброды ў цёмных калідорах, як зараз у нас у навуковых залах.

— А дзе будзе размешчаны новы будынак?

— Пакуль што выдзелілі месца ў раёне станцыі метро «Усход». Гэта вельмі далёка ад цэнтра. Людзям будзе нязручна туды ездзіць. Былі прапановы на праспекце Машэрава, побач з Палацам спорту. Але...

— Калі пачнецца будаўніцтва?

— Цяжка сказаць. Мабыць, не раней як праз два гады. Няма сродкаў.

Няўжо мы не знойдзем сродкаў, каб захаваць духоўныя скарбы айчыннай і сусветнай навукі, літаратуры і культуры? Каб захаваць інтэлектуальную скарбніцу суверэннай Беларусі.

Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

Маргарыта КАНДЫРАНДА (на здымку) — мадэльер-канструктар брэсцкага атэлье «Купалінка». Атрымаўшы высокую прафесіянальную падрыхтоўку ў Віцебскім тэхналагічным тэхнікуме, Маргарыта ўжо пяць гадоў шые прыгожае, элегантнае, моднае адзенне для жанчын. Многія брастаўчанкі ўдзячныя ёй за выдатна выкананыя заказы. Есць у дзяўчыны і захапленне. Яна з задавальненнем іграе ў спектаклях народнага тэатра брэсцкага Палаца прафсаюзаў.

Фота Эдуарда КАБЯКА. (БЕЛТА).

КАНФЛІКТНАЯ СІТУАЦЫЯ

Стан грамадства— крызісны, на прадпрыемствах— перадзабастовачны

ТАК ЛІЧАЦЬ У АСАЦЫЯЦЫІ НЕЗАЛЕЖНЫХ ПРАФСАЮЗАЎ ПРАМЫСЛОВАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аднабаковыя крокі ў рынак, зробленыя пры адсутнасці практычна ўсіх элементаў рыначнай інфраструктуры, парадзілі ліхаманку ў нашай эканоміцы і — адпаведна — адбіліся на ўсім грамадстве. Самая балючая з гэтых мер — так званая лібералізацыя цэн.

Асацыяцыя незалежных прафсаюзаў прамысловасці з гэтай нагоды прыняла адпаведную заяву, у якой адзначаецца: шэраг патрабаванняў і прапаноў прафсаюзаў па абароне эканамічных і сацыяльных інтарэсаў працоўных, усяго насельніцтва ўрадам рэспублікі ўлічаны. Таму прафсаюзы ад правядзення акцый пратэсту, у тым ліку і папераджальнай забастоўкі, часова ўстрымаліся. У той жа час многія прафсаюзныя патрабаванні Саўміну праігнараваў. Сітуацыя складваецца выбухованебяспечная...

Рэдакцыя папрасіла суставшынь Асацыяцыі незалежных прафсаюзаў прамысловасці А. БУХВОСТАВА і Г. ФЯДЫНІЧА больш падрабязна асвятліць матывы прыняцця вышэйпамянёнай заявы.

А. БУХВОСТАЎ: Наклейванне ярлыкоў — даўняя наша хвароба. Не буду ўступаць у дэмагагічныя спрэчкі, проста параю апанентам удумацца ў тое, чаго патрабуе логіка жыцця. Хочам мы таго ці не, але прафсаюзны рух расслойваецца. Федэрацыя прафсаюзаў у сваім ранейшым выглядзе была вельмі неаднароднай па структуры — аб'ядноўвала ажно 32 галіновыя прафсаюзы. Такі канглямерат яўна сябе не апраўдваў, бо амаль у кожнага меліся свае спецыфічныя мэты і задачы.

Да таго ж і разуменне многіх важных праблем у кіраўніцтва ФПБ і ў шэрагу галіновых прафсаюзаў было рознае, а радыкальныя прапановы «ніжэйстаячых» далёка не заўсёды браліся «вышэйстаячымі» пад увагу. Мы, напрыклад, ніяк не маглі пагадзіцца з захаваннем за ФПБ тых дзяржаўных функцый, якія былі «навешаны» прафсаюзам яшчэ ў сталінска-таталітарныя гады.

Паводле перакананняў, у прафсаюзаў можа быць толькі адна палітыка — абарона эканамічных і сацыяльных правоў людзей працы, аб'яднаных у прафесіянальны саюз. Наша асацыяцыя, свабодная ад уплыву розных палітычных партый і плыняў, уздзеяння дзяржаўных структур, з'яўляецца поўнасцю незалежнай у сваіх дзеяннях.

— Але ж, як мне здаецца, і ў незалежнай асацыяцыі ў нечым звязаны рукі. Глядзіце: усе гэтыя прафсаюзныя заявы і, прабачце, «апошнія кітайскія папярэджанні» нярэдка аказваюцца безвыніковымі. Ці не ад роспачы ўзнікаюць думкі аб забастоўках? Улады ж тым часам абвінавачваюць прафсаюзы ў папулізме, нагнятанні абстаноўкі, грубым сілавым націску.

Г. ФЯДЫНІЧ: Калі няма чым адказаць на справе, то зноў жа ў ход ідуць прывычныя ярлыкі. Звароты і прапановы ўраду з боку прафсаюзаў — гэта адзін з цывілізаваных метадаў давядзення да ўлад і грамадства пазіцыі працоўных. Забастоўка ж — хоць і суровы, але таксама нармальны, цывілізаваны від барацьбы, калі неабходна дабіцца прыняцця канкрэтных рашэнняў на карысць чалавека працы.

Заўважу: да голасу прафсаюзаў ураду ў апошні час прыходзіцца прыслухоўвацца. Так, 18 снежня мінулага года наша асацыяцыя перадала ў Саўмін рэспублікі свае патрабаванні — з нагоды мачоўкі адбыцца лібералізацыі цэн. Адначасова калектывы ўсіх прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у Асацыяцыю незалежных прафсаюзаў прамысловасці, былі гатовы правесці 24 снежня па ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь папераджальную аднагадзінную забастоўку. Але яна была адменена, паколькі ўрад у вызначаны тэрмін даў адказ.

Галоўнага, аднак, у дакументе няма. Кошт спажывецкай карзіны пасля лібералізацыі цэн узрос (па афіцыяльных даных) больш чым у 2,46 раза. І ў той жа час зусім не вызначаны крыніцы фінансавання дадатковага павышэння зарплаты, сацыяльных выплат у залежнасці ад рэальнага росту індэкса цэн у суадносінах не менш як 0,8 да 1,0. Зноў кіраўнікі нашай эканомікі аказаліся без уласнай праграмы, не гатовымі да павароту падзей. Пасля леташняга красавіка яны ўсё ківалі ў бок саюзнага паўлаўскага ўрада, каго ж будуць абвінавачваць цяпер?

— І таму сітуацыя на прадпрыемствах застаецца перадзабастовачнай? Але яе, відаць, падсілкоўваюць і іншыя акалічнасці, адзначаныя ў заяве асацыяцыі. У прыватнасці (цытую): «Працоўныя калектывы не бачаць і не адчуваюць рэальных дзеянняў урада па нарошчванню вытворчасці тавараў штодзённага попыту і прадуктаў харчавання, без чаго ніякія рашэнні аб лібералізацыі цэн не прывядуць да насычэння рынку».

Прабачце, але канстатацыя гэтага харэннага факта менавіта ў такой плоскасці мне асабіста здаецца, хоць і справядлівай, але наіўнай. Ясна, як дзень, што ранейшымі адміністрацыйна-загаднымі метадамі ўладныя органы эканоміку не падымуць. За пустымі размовамі аб неабходнасці рынку ніякіх рыначных структур яны не стварылі, умацаванню недзяржаўнага прадпрымальніцтва не дапамаглі. Хто ж цяпер будзе на канкурэнтнай аснове вырабляць тавары і прадукты? Дзе шукаць паратунку абрабаванаму спажыўцу?

А. БУХВОСТАЎ: У нечым з вамі можна пагадзіцца, у нечым — паспрачацца. Але я падкрэслю самае, на маю думку, важнае: цяперашні ўрад, па ўсім відаць, няздольны зрабіць галоўнае — даць зялёнае святло стварэнню сапраўднага рынку. Большасць кіраўнікоў і спецыялістаў, якія там працуюць, проста псіхалагічна да гэтага не гатовы, бо прывыклі толькі загадваць ды размяркоўваць.

Каго мы цяпер бачым натуральным саюзнікам — дык гэта новых прадпрымальнікаў. Магчыма, у свой час нашы інтарэсы разыдуцца, але сёння ў нас з імі адна мэта — працаваць дзеля стварэння новых рабочых месц, крыніц заработку для людзей. А гэта значыць — змяншэнне беспрацоўя, аслабленне сацыяльнай напружанасці.

— У той жа час шмат размоў аб неабходнасці раўнапраўнага сацыяльнага партнёрства паміж афіцыяльнымі ўладамі і працоўнымі масамі, аб'яднанымі ў прафсаюзы. З гэтай нагоды на думку прыходзіць вопыт краін Захаду, на які мы прывыклі спасылацца дзе трэба і дзе не трэба. Дык вось, там практычна кожны год пачынаецца з заключэння так званых тарыфных пагадненняў паміж прафсаюзамі і прадпрымальнікамі, у гэтым прымаюць удзел і ўрадавыя структуры. У нас жа гэты прынцыповы момант чамусьці ўсялях абходзяць...

Г. ФЯДЫНІЧ: У Беларусі галіновыя тарыфныя пагадненні на бягучы год не прыняты па сённяшні дзень — і зноў па віне ўрада. З якой перспектывай працаваць рабочаму чалавеку ў такіх прыцемках? Такая пазіцыя ўлад — гэта працяг ігнаравання прафсаюзаў, усё тыя ж спробы прынізіць іх ролю ў жыцці грамадства і той жа бюракратычны стыль работы. Яны самі распрацавалі дакументы аб неабходнасці заключэння пагадненняў — і самі сарвалі ўсе тэрміны. Як мы можам падтрымліваць урад пры такіх адносінах з яго боку да жыццёва важных інтарэсаў прафсаюзаў?

Кошт жыцця ўзрос неймаверна, і ці трэба гаварыць, што давер людзей да ўладных структур упаў да ніжэйшай адзнакі. «Паўлаўскую» кампенсацыю ў 60 рублёў называлі ў народзе падманам і ашуканствам. А сума ў 350 рублёў — такім вызначаны ў рэспубліцы мінімальны пражытачны мінімум — гэта не падман? Сёння ж кілаграм каўбасы каштуе 200 рублёў, пара ботаў — ажно 700! Купонаў жа на заработак у 350 «рэз» рабочаму чалавеку выдаецца толькі на суму 210 рублёў — жыві як хочаш, хадзі галодны.

Так што шок ідзе за шокам, а дзе ж тэрапія? Тыя, як бы сказаць, «тэрапеўты», якія працуюць у Дзяржкампрацы, і сёння ўсё трымаюць у тайне, не паказваюць методыкі разлікаў: сапраўды, з якіх разлікаў з'явіўся кошт спажывецкай карзіны, адкуль выведзены каэфіцыент яго росту 2,46? А на гэтай жа, прабачце, «базе» і вырасла недарэчная лічба пражытачнага мінімуму. Такая вось шчырасць і адкрытасць у адносінах да насельніцтва...

— Наколькі мне вядома, пытанне канверсіі прадпрыемстваў ваеннай вытворчасці — яшчэ адна болевая ваша кропка. На гэтых заводах працуюць у Беларусі дзесяткі тысяч людзей, і калі яны застануцца без работы, без сродкаў да існавання, то далейшую сітуацыю не хочацца нават і прагназіраваць.

А. БУХВОСТАЎ: Канверсія— гэта якраз адна з тых праблем, па якой у свой час мы разышліся з кіраўніцтвам ФПБ. Яшчэ мінулай восенню мы настойвалі на тым, што рэспубліцы ў гэтым плане неабходна адпаведная праграма, а нам адказвалі — гэта, маўляў, утопія. Тым больш такі падыход быў характэрны для многіх кіраўнікоў у Саўміне. Урад цяпер спісаў даўгі з шэрагу прадпрыемстваў «абаронкі», з Мінскага ВА вылічальнай тэхнікі, напрыклад,— прыкладна 150 мільёнаў рублёў. А далей? Якую прадукцыю будуць вырабляць для спажыўца 28 тысяч рабочых і інжынераў? Як захаваць навуковы і культурны патэнцыял велізарнай вытворчасці? Хто пра гэта павінен думаць?

Г. ФЯДЫНІЧ: Пра ўстойлівую тэндэнцыю праяўляць недальнабачнасць, якая характэрна для цяперашняга саставу ўрада, я таксама мог бы гаварыць шмат. Спынюся толькі на сітуацыі, што ўзнікла пасля стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Як вядома, акрамя іншых дакументаў было падпісана і міжурадавае пагадненне аб захаванні дагаворных абавязацельстваў у прамысловасці ў першым квартале на ўзроўні не менш 70 працэнтаў ад аб'ёмаў адпаведнага перыяду мінулага года. Высокі дагавор ужо трашчыць па ўсіх швах: прадпрыемствы многіх дзяржаў-рэспублік гэта рашэнне не выконваюць. Заводы Беларусі — на грані спынення, іх рабочыя, што называецца, за міліметр ад беспрацоўя. Хто ж зоймецца тэрміновай распрацоўкай антыманапольнага заканадаўства ў рамках СНД?

Атрымліваецца, што ўрады Садружнасці, ва ўсякім разе беларускі, зноў спазняюцца. Ці трэба здзіўляцца, што працоўныя, іх прафсаюзныя арганізацыі ўсё больш крытычна ставяцца да той незайздроснай ролі, якую ім адвялі: рашэнні па ўласнаму разуменню прымаюць адны, а іх памылкі сваім жабрацкім рублём пакрываюць зусім іншыя.

ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ: Як жыць далей—гэта пытанне сёння на вуснах кожнага з нас, і таму можна ў нечым зразумець прафсаюзных лідэраў, рэзкасць іх выказванняў і меркаванняў, якія падаюцца ў газеце ў «непрычасаным» выглядзе. Ёсць, аднак, і нямала спрэчных думак.

Так, у цяперашніх складаных умовах у рабоце ўрада здараліся і хібы, і пралікі,—ды і ці можа быць інакш, калі ідзеш невядомым шляхам і вырашэнне далёка не ўсіх праблем залежыць ад цябе самога? Затое шмат было зроблена якраз для таго, каб зменшыць адмоўны ўплыў вядомых негатыўных працэсаў на эканоміку рэспублікі.

Як вядома, ісціна часцей за ўсё недзе пасярэдзіне паміж процілеглымі пунктамі гледжання. Шукаць яе трэба ўсім разам—такі Імператыў часу.

Гутарку вёў Валерый ЧАРНЯЎСКІ, аглядальнік «Звязды».

Прафсаюзы папярэджваюць

Ужо два тыдні, як мы жывём ва ўмовах лібералізаваных цэн. Жыццё стала горшым (хоць, здавалася б, куды ўжо горш?). Хто ж абароніць чалавека працы ад выбрыкаў рынку?

На такім невясёлым грамадскім фоне прайшоў учора пленум савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Яго ўдзельнікі абмеркавалі тактыку дзеянняў прафсаюзаў ва ўмовах свабодных рыначных цэн і падзення жыццёвага ўзроўню працоўных. Вызначаны і задачы савета ФПБ па абароне інтарэсаў працоўных пры правядзенні раздзяржаўлення і прыватызацыі ўласнасці.

Падтрымліваючы курс на пераход да рынку, ФПБ, тым не менш, настойвае на ажыццяўленні канкрэтных мер па забеспячэнню сацыяльнай абароны насельніцтва. Выказана думка, што і самі прафсаюзы павінны больш рашуча дзейнічаць у гэтым напрамку.

Каб не дапусціць далейшага збяднення насельніцтва, сацыяльнага выбуху, прафсаюзы патрабуюць захавання рабочых месц, забеспячэння з боку дзяржавы рэгулярнага паступлення тавараў, захавання на пераходны перыяд фіксаванага ўзроўню цэн на прадукты харчавання і тавары першай неабходнасці. Ужо ў лютым неабходна зрабіць пераразлік кошту спажывецкай карзіны з улікам рэальных цэн.

Удзельнікі пленума заявілі, што, калі прапановы прафсаюзаў не будуць улічаны, савет ФПБ у першай палавіне лютага будзе гатовы — па ўзгадненню з працоўнымі калектывамі— да правядзення масавых акцый пратэсту.

Галіна АКУЛАВА.

З А К О Н

Рэспублікі Беларусь

Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый

ГЛАВА I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Плацельшчыкі падаткаў

Плацельшчыкамі падаткаў на даходы і прыбытак з'яўляюцца прадпрыемствы, аб'яднанні, арганізацыі, установы, іх філіялы, прадстаўніцтвы, аддзяленні і іншыя адасобленыя падраздзяленні, якія ажыццяўляюць гаспадарчую і іншую камерцыйную дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, незалежна ад падпарадкаванасці і форм уласнасці*.

Артыкул 2. Аб'екты падаткаабкладання

1. Падаткам на даходы абкладаюцца даходы, атрыманыя прадпрыемствамі ад прыналежных ім акцый, аблігацый і іншых каштоўных папер; ад долевага ўдзелу ў сумесных прадпрыемствах; відэапаказу; масавых канцэртна - відовішчных мерапрыемстваў, эксплуатацыіігравых аўтаматаў з грашовым выйгрышам, ігральна - прызавых атракцыёнаў; здачы ў арэнду дзяржаўнай маёмасці, рэалізацыі маёмасці і замежнай валюты; правядзення латарэй.

Для мэт падаткаабкладання з выручкі, атрыманай ад указаных мерапрыемстваў, вылічаюцца матэрыяльныя затраты, звязаныя з атрыманнем гэтага даходу.

2. Прыбытак, які абкладаецца падаткам, вылічаецца выходзячы з балансавага прыбытку, што ўяўляе сабой суму прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг), іншых матэрыяльных каштоўнасцей (уключаючы асноўныя фонды) і даходаў ад пазарэалізацыйных аперацый, зменшаных на суму расходаў па гэтых аперацыях.

У склад даходаў ад пазарэалізацыйных аперацый уключаюцца даходы, якія паступілі ва ўласнасць атрымальніка ад аперацый, непасрэдна не звязаных з вытворчасцю прадукцыі (работ, паслуг) і яе рэалізацыяй.

У склад падаткаабкладаемага прыбытку будаўнічых арганізацый не ўключаюцца сродкі, якія атрымліваюцца ад заказчыка на развіццё матэрыяльна - тэхнічнай базы будаўніцтва.

3. Прадпрыемствы, якія не знаходзяцца на гаспадарчым разліку і атрымліваюць даходы ад гаспадарчай і камерцыйнай дзейнасці, падатак выплачваюць з сум перавышэння даходаў над расходамі, якія атрымліваюцца ад гэтай дзейнасці.

4. Сумы штрафных санкцый, якія ўносяцца ў бюджэт у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, выплачваюцца за кошт прыбытку, што застаецца ў распараджэнні прадпрыемства.

5. Прыбытак (даход), які абкладаецца падаткам, зменшаецца на суму вылічанага падатку на нерухомасць за асноўныя фонды.

Артыкул 3. Затраты па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг), якія ўключаюцца ў яе сабекошт

1. У сабекошт прадукцыі (работ, паслуг) пры вызначэнні прыбытку ўключаюцца:

— матэрыяльныя затраты (за вылікам кошту эваротных адходаў);

— расходы на аплату працы;

— амартызацыйныя адлічэнні на поўнае аднаўленне асноўных вытворчых фондаў;

— адлічэнні на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне;

— адлічэнні на абавязковае медыцынскае страхаванне;

— плацяжы па абавязковаму страхаванню маёмасці, якая ўлічваецца ў складзе вытворчых фондаў;

— плата па працэнтах за кароткатэрміновыя пазыкі банкаў (акрамя працэнтаў па пратэрмінаваных і адтэрмінаваных пазыках і пазыках, атрыманых на папаўненне недахопу ўласных абаротных сродкаў і на набыццё асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў);

— іншыя расходы на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі, уключаючы расходы па ўсіх відах рамонту асноўных вытворчых фондаў, а таксама падаткі ў бюджэт, якія адносяцца на сабекошт прадукцыі, адлічэнні ў спецыяльныя фонды, прадугледжаныя заканадаўствам;

— затраты па ўтрыманню аб'ектаў аховы здароўя, дзіцячых дашкольных устаноў, устаноў культуры і спорту, якія знаходзяцца на балансе, у адпаведнасці з нарматывамі затрат, устаноўленымі для бюджэтных арганізацый.

2. Да матэрыяльных затрат адносяцца затраты на сыравіну і асноўныя матэрыялы (за вылікам кошту эваротных адходаў), пакупныя вырабы і паўфабрыкаты, дапаможныя матэрыялы, паліва, энергію, затраты, звязаныя з выкарыстаннем прыроднай сыравіны (адлічэнні на пакрыццё затрат па геалагаразведачных і геолагапошукавых работах, па карысных выкапнях, у тым ліку падатак за карыстанне прыроднымі рэсурсамі (экалагічны падатак), затраты на рэкультывацыю зямель, плата, якая бярэцца за драўніну, што адпускаецца на корані), затраты на работы і паслугі вытворчага характару, выкананыя пабочнымі прадпрыемствамі і арганізацыямі.

3. У склад расходаў на аплату працы ўключаюцца выплаты па заработнай плаце, вылічаныя зыходзячы са здзельных расцэнак, тарыфных ставак і службовых акладаў, якія ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад вынікаў працы, яе колькасці і якасці, стымулюючых і кампенсуючых выплат, уключаючы кампенсацыі па аплаце працы ў сувязі з павышэннем і індэксацыяй цэн, сістэм прэміравання рабочых, кіраўнікоў, спецыялістаў і іншых служачых за вытворчыя вынікі, іншых умоў аплаты працы ў адпаведнасці з прымяняемымі на прадпрыемствах формамі і сістэмамі аплаты працы, а саўгасамі, калгасамі і іншымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі таксама ўключаюцца выплаты па выніках работы за год, якія вызначаюцца ва ўстаноўленым парадку.

У сабекошт прадукцыі (работ, паслуг) не ўключаюцца наступныя выплаты ў грашовай і натуральнай формах: матэрыяльная дапамога, узнагароджанні па выніках работы за год, аднаразовыя заахвочванні асобных работнікаў за выкананне асабліва важных вытворчых заданняў, аплата дадатковa прадастаўляемых па рашэнню працоўнага калектыву (звыш прадугледжаных заканадаўствам) водпускаў работнікам, у тым ліку жанчынам, якія выхоўваюць дзяцей, надбаўкі да пенсій, аднаразовыя дапамогі ветэранам працы, якія выходзяць на пенсію, даходы (дывідэнды, працэнты), што выплачваюцца па акцыях працоўнага калектыву і ўкладах членаў працоўнага калектыву ў маёмасць прадпрыемства, аплата жылля, прэміі за стварэнне, асваенне і ўкараненне новай тэхнікі, за выкананне планаў па новай тэхніцы, па выніках спаборніцтваў, агляду, конкурсаў, накіраваных на выяўленне і выкарыстанне рэзерваў вытворчасці і павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, а таксама іншыя выплаты, якія праводзяцца за кошт прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства або іншых мэтавых паступленняў.

4. Амартызацыйныя адлічэнні на поўнае аднаўленне асноўных фондаў праводзяцца выходзячы з балансавага кошту асноўных вытворчых фондаў і зацверджаных ва ўстаноўленым парадку норм, уключаючы паскораную амартызацыю іх актыўнай часткі, якая праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Прадпрыемствы, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць на ўмовах арэнды, уключаюць у сабекошт амартызацыйныя адлічэнні на поўнае аднаўленне як па ўласных, так і па арандаваных асноўных фондах.

Сумесныя прадпрыемствы, створаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з удзелам замежных юрыдычных асоб і грамадзян, праводзяць амартызацыйныя адлічэнні на поўнае аднаўленне па нормах і ў парадку, устаноўленым для прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана ўстаноўчымі дакументамі сумеснага прадпрыемства.

5. Асаблівасці складу затрат, якія ўключаюцца ў сабекошт прадукцыі (работ, паслуг) у асобных галінах народнай гаспадаркі, устанаўліваюцца ў парадку, што прадугледжваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Стаўкі падаткаў

1. Даходы, атрыманыя прадпрыемствамі ад прыналежных ім акцый, аблігацый і іншых каштоўных папер: ад долевага ўдзелу ў сумесных прадпрыемствах з удзелам замежных юрыдычных асоб і грамадзян, а таксама ў сумесных прадпрыемствах без удзелу замежнага капіталу, абкладаюцца па стаўцы 15 працэнтаў. Падатак бярэцца ў крыніцы даходу.

2. Даходы, атрыманыя ад казіно, відэасалонаў, эксплуатацыі ігравых аўтаматаў з грашовым выйгрышам, ігральна-прызавых атракцыёнаў, ад правядзення масавых канцэртна - відовішчных і іншых (акрамя спартыўных) мерапрыемстваў на адкрытых пляцоўках, стадыёнах, у памяшканнях, падлягаюць абкладанню падаткам па стаўцы 60 працэнтаў.

Наведванне гледачамі відэасалонаў, казіно, масавых канцэртна - відовішчных мерапрыемстваў на адкрытых пляцоўках, стадыёнах, у памяшканнях павінна арганізоўвацца толькі па ўваходных білетах, выраблены ва ўстаноўленым парадку.

Білеты падлягаюць абавязковай рэгістрацыі ў падатковай інспекцыі па месцы правядзення мерапрыемстваў.

Рэалізацыя білетаў любымі гаспадарніцкімі суб'ектамі без рэгістрацыі ў падатковай інспекцыі разглядаецца як утойванне даходаў.

3. Даходы, атрыманыя ад здачы ў арэнду прадпрыемстваў, цэхаў, участкаў з вытворчым абсталяваннем, якое належыць на праве ўласнасці дзяржаве (акрамя прадпрыемстваў, для якіх гэта з'яўляецца асноўным відам дзейнасці), абкладаюцца падаткам па стаўцы 50 працэнтаў.

4. Дадатковыя даходы, атрыманыя ад продажу прадукцыі, тавараў, маёмасці на аўкцыёнах, падлягаюць абкладанню падаткам па стаўцы 80 працэнтаў. Дадатковая выручка (даход) ад рэалізацыі прадукцыі і маёмасці, прынятых ад насельніцтва для рэалізацыі на аўкцыёнах, падлягае абкладанню падаткам па стаўцы 50 працэнтаў.

5. Даходы ад продажу замежнай валюты, атрыманай прадпрыемствамі ад рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг) уласнай вытворчасці, абкладаюцца падаткам па стаўцы 15 працэнтаў, даходы ад продажу замежнай валюты, атрыманай ад іншых відаў дзейнасці, — па стаўцы 60 працэнтаў.

6. Даходы, атрыманыя ад правядзення латарэй, падлягаюць абкладанню падаткам па стаўцы 40 працэнтаў.

7. Прыбытак, атрыманы ад пасрэдніцкай дзейнасці, абкладаецца падаткам па стаўцы 60 працэнтаў.

Даходы, атрыманыя ад біржавой, брокерскай дзейнасці, абкладаюцца падаткам па стаўцы 60 працэнтаў.

8. Прыбытак прадпрыемстваў абкладаецца падаткам па стаўцы 30 працэнтаў.

9. Прыбытак камерцыйных, кааператыўных банкаў, страхавых арганізацый абкладаецца падаткам па стаўцы 44 працэнты.

10. Прыбытак сельскагаспадарчых прадпрыемстваў індустрыяльнага тыпу абкладаецца падаткам па стаўках, якія ўстанаўліваюцца абласнымі і Мінскім гарадскім Саветамі народных дэпутатаў, але не вышэй стаўкі, указанай у пункце 8 гэтага артыкула.

Артыкул 5. Ільготы па падаткаабкладанню

1. Гэтым Законам прадугледжваюцца ільготы па падаткаабкладанню, якія носяць пастаянны характар. Дадатковыя ільготы ўстанаўліваюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь пры зацвярджэнні бюджэту Рэспублікі Беларусь на чарговы год.

2. Прыбытак, які абкладаецца падаткам, вылічаны ў адпаведнасці з артыкулам 2 гэтага Закона, зменшаецца на:

а) прыбытак, фактычна выкарыстаны на мерапрыемствы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у адпаведнасці з рэспубліканскай праграмай;

б) прыбытак, фактычна выкарыстаны на правядзенне прыродаахоўных і супрацьпажарных мерапрыемстваў, навукова - даследчых і доследна-канструктарскіх работ:

в) прыбытак, фактычна выкарыстаны на расшырэнне (развіццё) вытворчасці, а таксама на павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання, паліўна - энергетычнага комплексу, будаўнічых матэрыялаў і пагашэнне банкаўскіх крэдытаў, атрыманых на гэтыя мэты пры недастатковасці ўласных крыніц на пачатак справаздачнага года.

Пры гэтым агульная сума льгатаванага прыбытку, выкарыстанага на мерапрыемствы, указаныя ў падпунктах «а», «б» і «в», не можа перавышаць 50 працэнтаў балансавага прыбытку:

г) суму затрат, якія ажыццяўляюцца за кошт прыбытку, што застаецца ў распараджэнні прадпрыемстваў, па ўтрыманню піянерскіх лагераў, устаноў народнай адукацыі, дамоў састарэлых і інвалідаў, аб'ектаў жыллёвага фонду, якія знаходзяцца на іх балансе, у адпаведнасці з нарматывамі затрат па аналагічных установах, што ўтрымліваюцца за кошт сродкаў бюджэту, а таксама затрат на гэтыя мэты пры долевым удзеле прадпрыемстваў ва ўтрыманні ўказаных аб'ектаў і устаноў:

д) прыбытак гасразліковых лячэбна - вытворчых майстэрняў псіханеўралагічных бальніц, псіхіятрычных бальніц і дыспансераў, процітуберкулёзных устаноў, а таксама падсобных гаспадарак лячэбных устаноў; рамонтна - тэхнічных і транспартных арганізацый лячэбных устаноў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў бюджэту;

е) прыбытак прадпрыемстваў ад вытворчасці пратэзна-артапедычных вырабаў, сродкаў рэабілітацыі і абслугоўвання інвалідаў;

ж) прыбытак выдавецтваў і друкарняў, які атрымліваецца ад выдання літаратуры на беларускай мове;

з) сумы прыбытку, унесеныя зарэгістраваным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь грамадскім фондам, арганізацыям і асацыяцыям, якія ажыццяўляюць дабрачынную, экалагічную, аздараўленчую дзейнасць, пералік якіх штогод устанаўліваецца пры фарміраванні бюджэту рэспублікі, а таксама пералічаныя прадпрыемствам, установам і арганізацыям аховы здароўя, народнай адукацыі, сацыяльнага забеспячэння, культуры, фізкультуры і спорту. Расходы, указаныя ў гэтым падпункце, не могуць перавышаць 1 працэнта абкладаемага прыбытку, які вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 2 гэтага Закона;

і) суму ў размеры 50 працэнтаў прыбытку, атрыманага ад санаторна - курортнай, спартыўна - аздараўленчай дзейнасці;

к) суму ў размеры 50 працэнтаў абкладаемага прыбытку для прадпрыемстваў, папраўча - працоўных устаноў, якія прымяняюць працу асуджаных;

л) суму прыбытку прадпрыемстваў Міністэрства народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь, атрыманую ад выпуску прадукцыі для ўстаноў народнай адукацыі рэспублікі.

3. Вызваляюцца ад выплаты падатку на прыбытак вытворчыя майстэрні, вопытна-эксперыментальныя заводы, падсобныя гаспадаркі і іншыя прадпрыемствы навучальных устаноў, якія ажыццяўляюць практычнае навучанне студэнтаў і навучэнцаў.

4. Вызваляюцца ад выплаты падатку на прыбытак вучнёўскія прадпрыемствы, калі колькасць працуючых вучняў складае не менш 80 працэнтаў ад сярэднеспісачнай колькасці працуючых.

5. Вызваляюцца ад выплаты падатку на прыбытак арганізацыі інвалідаў, іх установы, вучэбна - вытворчыя прадпрыемствы і аб'яднанні, калі колькасць інвалідаў складае не менш 50 працэнтаў ад сярэднеспісачнай колькасці прамыслова - вытворчага персаналу.

Абкладаемы прыбытак указаных прадпрыемстваў і арганізацый змяншаецца на 50 працэнтаў, калі колькасць інвалідаў складае ад 30 да 50 працэнтаў ад сярэднеспісачнай колькасці прамыслова-вытворчага персаналу.

6. Вызваляюцца ад выплаты падатку на прыбытак прадпрыемствы ветэранаў вайны, працы, Узброеных Сіл, воінаў-інтэрнацыяналістаў, у якіх працуе не менш 70 працэнтаў пенсіянераў або воінаў - інтэрнацыяналістаў ад сярэднеспісачнай колькасці працуючых.

7. Пры вызначэнні прадпрыемствам права на атрыманне льгот, указаных у пунктах 4, 6 гэтага артыкула, у сярэднеспісачную колькасць работнікаў уключаюцца таксама і работнікі, якіх няма ў штаце прадпрыемства (якія працуюць па дагаворах падраду, іншых дагаворах грамадзянска - прававога характару і па сумяшчальніцтву).

8. Сумесныя прадпрыемствы, створаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з удзелам замежных юрыдычных асоб і грамадзян, калі доля замежнага ўдзельніка ў статутным фондзе перавышае 30 працэнтаў, і прадпрыемствы, што поўнасцю належаць замежным інвестарам (замежныя прадпрыемствы), уся выручка якіх утвараецца толькі за кошт рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг) уласнай вытворчасці, вызваляюцца ад выплаты падатку на прыбытак на працягу першых трох гадоў з моманту аб'яўлення прыбытку, уключаючы першы год аб'яўлення прыбытку.

9. Балансавы прыбытак сумесных прадпрыемстваў з удзелам замежных інвестараў, прадпрыемстваў, якія поўнасцю належаць замежным інвестарам (замежныя прадпрыемствы), змяншаецца на суму адлічэнняў у рэзервовы (страхавы) фонд у размерах, устаноўленых ва ўстаноўчых дакументах, але не больш 25 працэнтаў фактычна сфарміраванага статутнага фонду.

10. Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў могуць прадастаўляць дадатковыя льготы па падатку на даходы і прыбытак у межах сум падаткаў, якія залічваюцца ў мясцовыя бюджэты.

Артыкул 6. Парадак і тэрміны выплаты падатку

Парадак і тэрміны выплаты падатку ў адпаведнасці з гэтым Законам устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА II. АСАБЛІВАСЦІ ВЫЛІЧЭННЯ ПАДАТКУ НА ДАХОДЫ І ПРЫБЫТАК ЗАМЕЖНЫХ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ

Артыкул 7. Плацельшчыкі падатку

Плацельшчыкамі падатку з'яўляюцца замежныя юрыдычныя асобы, якія прызнаюцца такімі па заканадаўству краіны іх пастаяннага месцапрабывання.

Даходы асабістых кампаній для мэт падаткаабкладання разглядаюцца як даходы ўладальнікаў гэтых кампаній і падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з грамадзян».

Гаспадарчая дзейнасць прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным Законам Рэспублікі Беларусь «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».

Адсутнасць рэгістрацыі замежнай юрыдычнай асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, разглядаецца як утойванне даходу, які падлягае падаткаабкладанню.

Артыкул 8. Аб'ект падаткаабкладання

1. Асаблівасці фарміравання прыбытку і склад затрат, якія ўлічваюцца пры яго вылічэнні, вызначаюцца ў парадку, што ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У выпадку, калі прамое вызначэнне прыбытку, атрыманага замежнай юрыдычнай асобай у сувязі з яе дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь, не прадстаўляецца магчымым, дапускаецца па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь вызначэнне прыбытку на падставе валавога даходу або панесеных расходаў.

Замежныя юрыдычныя асобы, якія атрымліваюць аплату ў выглядзе прадукцыі ці маёмасці ў якасці кампенсацыі за дзейнасць, што ажыццяўляецца ў Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, выплачваюць падатак на прыбытак, вылічаны выходзячы з дагаворных (кантрактных) цэн, цэн асноўных арганізацый - экспарцёраў або цэн, якія вызначаюцца на базе сусветных цэн на такую ж ці аналагічную прадукцыю або маёмасць.

2. Замежная юрыдычная асоба, якая ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь, карыстаецца ўсімі льготамі, прадастаўленымі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для падаткаплацельшчыкаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі пагадненнямі.

Артыкул 9. Парадак вылічэння і тэрміны выплаты падатку

1. Падатак на даходы і прыбытак замежных юрыдычных асоб вылічваецца штогод падатковым органам па месцы знаходжання замежнай юрыдычнай асобы або яе пастаяннага прадстаўніцтва.

2. Замежная юрыдычная асоба, што ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь, не пазней 15 красавіка года, які ідзе за справаздачным, прадстаўляе ў падатковы орган справаздачу аб дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама дэкларацыю аб даходах па форме, якая зацверджаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь. Пры спыненні дзейнасці да заканчэння каляндарнага года ўказаныя дакументы павінны быць прадстаўлены на працягу месяца з дня яе спынення.

Дэкларацыя аб даходах замежнай юрыдычнай асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь, падлягае штогадовай праверцы гасразліковай аўдытарскай арганізацыяй за плату.

3. На суму вылічанага падатку плацельшчыку выдаецца плацежнае паведамленне па форме, зацверджанай Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Падатак выплачваецца ў тэрміны, указаныя ў плацежным паведамленні, у безнаяўным парадку ў рублях і ў замежнай валюце, у прапорцыі атрымання выручкі ў грашовых адзінках, якія знаходзяцца ў абарачэнні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і замежнай валюце.

4. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

Палажэнні гэтага Закона не закранаюць падатковых прывілей, устаноўленых агульнымі нормамі міжнароднага права і спецыяльнымі пагадненнямі Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі.

5. Збіранне падаткаў на даходы і прыбытак замежных юрыдычных асоб можа быць спынена або абмежавана на аснове прынцыпу ўзаемнасці ў выпадках, калі ў адпаведнай замежнай дзяржаве такія ж меры ажыццяўляюцца ў адносінах да савецкіх юрыдычных асоб у прымяненні да такіх жа або аналагічных падаткаў, што павінна быць пацверджана падатковымі органамі гэтай дзяржавы.

6. Пры заключэнні камерцыйных здзелак з замежнымі фірмамі не дазваляецца ўключэнне ў кантракт падатковых агаворак, у адпаведнасці з якімі прадпрыемства, што выплачвае даход, бярэ на сябе абавязацельства несці расходы па выплаце падаткаў на даходы і прыбытак замежных юрыдычных асоб.

Артыкул 10. Падатак на даходы замежных юрыдычных асоб, не звязаныя з дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь

1. Замежныя юрыдычныя асобы, якія атрымліваюць даходы, не звязаныя з дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь, выплачваюць падатак у размеры 20 працэнтаў па даходах ад дывідэндаў, працэнтаў, аўтарскіх правоў і ліцэнзій, фрахту, арэндных плацяжоў і іншых даходах, крыніца якіх знаходзіцца ў Рэспубліцы Беларусь і якія не звязаны з ажыццяўленнем дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва.

Сумы даходу ад фрахту, які выплачваецца замежным юрыдычным асобам у сувязі з ажыццяўленнем міжнародных перавозак, абкладаюцца падаткам па стаўцы 6 працэнтаў.

2. Даходы ў выглядзе працэнтаў па крэдытах, прадастаўленых для ажыццяўлення асобных дзяржаўных праграм, вызваляюцца ад абкладання падаткам.

3. Замежная юрыдычная асоба, якая мае ў адпаведнасці з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь права на поўнае або частковае вызваленне ад падатку даходаў з крыніц у Рэспубліцы Беларусь, падае заяву аб зніжэнні або адмене падатку ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

4. Падатак з даходаў замежных юрыдычных асоб з крыніц Рэспубліцы Беларусь утрымліваецца прадпрыемствам, якое выплачвае даход замежнай юрыдычнай асобе, у валюце пераводу з поўнай сумы даходу пры кожным пералічэнні плацяжу.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

22 снежня 1991 г. г. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый» з 1 студзеня 1992 года.

2. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый» прымяняецца прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі пры разліках з бюджэтам, пачынаючы з вынікаў дзейнасці ў 1992 годзе.

3. Устанавіць, што ў 1992 годзе за перавышэнне тэмпаў росту аплаты працы над тэмпамі росту аб'ёму рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг) бярэцца з прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый (акрамя замежных юрыдычных асоб і сумесных прадпрыемстваў, доля замежнага капіталу якіх у статутным фондзе перавышае 30 працэнтаў) дадатковы падатак на прыбытак па стаўках, павялічаных у 1,5 раза з сумы сродкаў на аплату працы, якая перавышае яе рост выходзячы з тэмпу росту рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг).

За базу для вызначэння прыросту сродкаў на аплату працы прымаецца фактычна склаўшаяся сярэдняя заработная плата на аднаго працуючага за папярэдні квартал, але не больш як пяць мінімальных заработных плат з улікам індэксацыі.

Да сродкаў на аплату працы адносяцца: усе віды заработнай платы (акрамя кампенсацыі і індэксацыі ў сувязі з інфляцыяй), прэміі і заахвочванні, матэрыяльная дапамога, аплата водпускаў, надбаўкі і даплаты, аплата прастояў, выхадныя дапамогі, сумы прадастаўленых сацыяльных ільгот у выглядзе аплаты харчавання, пуцёвак, праезду і г. д., аднаразовыя дапамогі і ўзнагароджанні, прадастаўленне бязвыплатных пазык, кошт прадукцыі і тавараў, якія выдаюцца ў натуральным выражэнні, іншыя выплаты, што носяць індывідуальны характар.

Па дзяржаўных прадпрыемствах, якія не прынялі да выканання дзяржаўны заказ, стаўка падатку на прыбытак павялічваецца на 5 адзінак.

Прадпрыемствы, якія забяспечваюць вытворчасць і пастаўку гандлёючым арганізацыям тавараў народнага спажывання (акрамя віна, лікёра-гарэлачных і тытунёвых вырабаў) звыш узроўню мінулага года, уносяць у бюджэт падатак на прыбытак, атрыманы ад гэтага прыросту, па стаўках, паніжаных на 50 працэнтаў; па віну і лікёра-гарэлачных вырабах — па стаўках, паніжаных на 20 працэнтаў.

4. Устанавіць, што захоўваецца дзеянне падатковых ільгот, прадугледжаных артыкулам 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу» і артыкулам 43 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь».

5. Абласным і Мінскаму гарадскому Саветам народных дэпутатаў да 1 лютага 1992 года вызначыць памеры ставак падатку на прыбытак, які атрымліваецца ад рэалізацыі прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі калгасамі, саўгасамі і іншымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі.

6. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

падрыхтаваць пералік грамадскіх фондаў і арганізацый, што ажыццяўляюць дабрачынную, экалагічную і аздараўленчую дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, на якія распаўсюджваецца дзеянне падпункта «з» пункта 2 артыкула 5 Закона. Прадставіць указаны пералік на зацвярджэнне Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адначасова з праектам Закона «Аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на 1992 год»;

распрацаваць палажэнне, згодна з якім прадпрыемствы, аб'яднанні і арганізацыі павінны адносіцца да аграпрамысловага комплексу;

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

у месячны тэрмін зацвердзіць інструкцыю аб парадку і тэрмінах выплаты падаткаў у адпаведнасці з гэтым Законам.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

22 снежня 1991 г. г. Мінск.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб падатку на нерухомасць

Артыкул 1. Плацельшчыкі падатку

Плацельшчыкамі падатку на нерухомасць з'яўляюцца юрыдычныя асобы незалежна ад форм уласнасці, іх філіялы, аддзяленні, прадстаўніцтвы і іншыя адасобленыя падраздзяленні, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, а таксама фізічныя асобы.

Артыкул 2. Аб'ект падаткаабкладання

Падаткам абкладаецца вартасць асноўных вытворчых і невытворчых фондаў, аб'ектаў новага і незавершанага будаўніцтва, якія з'яўляюцца ўласнасцю юрыдычных асоб, а таксама вартасць прыналежных фізічным асобам будынкаў.

Артыкул 3. Стаўкі падатку

1. Гадавая стаўка падатку на нерухомасць для юрыдычных асоб устанаўліваецца ў размеры 5 працэнтаў, для фізічных асоб — 0,1 працэнта ад вартасці аб'екта падаткаабкладання.

2. Стаўка падатку за нанава распачатае будаўніцтва (расшырэнне) аб'ектаў вытворчага прызначэння, якое ажыццяўляецца за кошт сродкаў юрыдычных асоб, устанаўліваецца ў размеры 30 працэнтаў каштарыснай вартасці аб'ектаў будаўніцтва.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь можа дыферэнцыраваць стаўкі падатку па рэгіёнах Рэспублікі Беларусь у межах да 30 працэнтаў.

3. Гадавая стаўка падатку на незавершанае будаўніцтва ўстанаўліваецца ў размеры 10 працэнтаў вартасці звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва па стану на пачатак справаздачнага квартала.

Артыкул 4. Ільготы па падатку

1. Вызваляюцца ад абкладання падаткам:

аб'екты сацыяльна-культурнага і бытавога прызначэння, а таксама жылы фонд мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, прадпрыемстваў і арганізацый;

вытворчыя фонды арганізацый таварыстваў інвалідаў;

асноўныя вытворчыя фонды прадпрыемстваў сувязі;

збудаванні, прызначаныя для аховы навакольнага асяроддзя і паляпшэння экалагічнай абстаноўкі.

Пералік збудаванняў, прызначаных для аховы навакольнага асяроддзя і паляпшэння экалагічнай абстаноўкі, вызначаецца Дзяржаўным камітэтам па экалогіі Рэспублікі Беларусь;

жылыя дамы і надворныя будынкі, што належаць фізічным асобам, якія з'яўляюцца пенсіянерамі па ўзросту, інвалідамі I і II груп, і іншым непрацаздольным грамадзянам пры адсутнасці сумесна пражываючых працаздольных членаў сям'і; будынкі, што належаць сем'ям, галавой якіх з'яўляюцца бацькі або муж і жонка ваеннаслужачых, работнікаў Міністэрства ўнутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, загінуўшых або прапаўшых без вестак пры выкананні службовых абавязкаў.

2. Не бярэцца падатак за нанава распачатае будаўніцтва аб'ектаў па выпуску спецыяльнай прадукцыі для ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; тавараў народнага спажывання; будаўнічых канструкцый, вырабаў і матэрыялаў; санітарна-тэхнічнага абсталявання; па перапрацоўцы, захаванню сельскагаспадарчай прадукцыі; па аказанню паслуг насельніцтву і аб'ектаў, якія з'яўляюцца ўласнасцю таварыстваў інвалідаў.

3. Не абкладаецца падаткам вартасць незавершанага будаўніцтва на будаўнічых аб'ектах і будоўлях, закансерваваных па рашэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Парадак вылічэння і тэрміны выплаты падатку ў бюджэт

1. Юрыдычнымі асобамі падатак вызначаецца штоквартальна выходзячы з наяўнасці асноўных вытворчых і невытворчых фондаў па рэшткавай вартасці на пачатак квартала і 1/4 зацверджанай гадавой стаўкі. Па распачатых будаўнічых аб'ектах падатак уносіцца аднаразова. Фізічнымі асобамі падатак вызначаецца выходзячы са страхавой ацэнкі прыналежных ім будынкаў на пачатак года.

2. Юрыдычныя асобы вылічваюць суму падатку самастойна і прадстаўляюць разлікі ў падатковыя органы не пазней 15 чысла месяца, які ідзе ,за справаздачным кварталам.

У выпадках, калі квартальная сума плацяжоў перавышае 100 тыс. руб., уносяцца аванса выя плацяжы.

3. Фізічныя асобы ўносяць у бюджэт сумы падатку на падставе паведамленняў дзяржаўных падатковых інспекцый.

4. Вылічэнне падатку на звышнарматыўнае незавершанае будаўніцтва пачынаецца па заканчэнні ўстаноўленага тэрміну будаўніцтва. Падатак уносіцца падраднай будаўнічай арганізацыяй — генеральным падрадчыкам — за кошт прыбытку, які застаецца ў яго распараджэнні. Сума падатку вызначаецца выходзячы з вартасці незавершанага будаўніцтва на пачатак квартала і 1/4 зацверджанай гадавой стаўкі.

5. За нанава распачатае будаўніцтва падатак уносіцца заказчыкам.

6. Усе сумы падаткаў з юрыдычных і фізічных асоб залічваюцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь.

7. Тэрміны ўнясення падатку вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 снежня 1991 г. г. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
АБ ПАРАДКУ ЎВЯДЗЕННЯ Ў ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РОЗГАЛАС

ЗНОЎ НЕМЦЫ ВЫРУЧЫЛІ

Шэсць дзён на Гомельшчыне знаходзілася дэлегацыя замежнай царквы горада Гановера з Ніжняй Саксоніі, якую ўзначальвала Эвелін Штэвезанд. У гэты раз на трох грузавых аўтамабілях дастаўлены некалькі тон медыкаментаў і падарункаў для чарнобыльцаў. Усё гэта было перададзена ў бальніцы Гомеля, Веткі і Брагіна, а таксама мнагадзетным сем'ям. Нямецкія госці прынялі ўдзел у царкоўнай службе і разам з гамяльчанамі святкавалі Каляды.

АРХІЎ НЕ ПРОСТА АДЧЫНЯЎСЯ

Сховішчы архіва КПБ, якія са жніўня былі апячатаны, сёння ўскрыты. Пачалася перадача партыйных дакументаў у нацыянальны архіў рэспублікі, які ствараецца на базе былога сховішча тайнаў КПБ. Першымі будуць апісаны дакументы агульнага аддзела. У асноўным гэта асабістыя справы партыйнай эліты, вядомых палітычных дзеячаў.

— Многія дакументы датычацца і сёння палітычна актыўных людзей, ёсць асабістыя справы першых асоб партыі, у тым ліку і Пятра Міронавіча Машэрава, — гаворыць начальнік Галоўнага архіўнага ўпраўлення рэспублікі Аляксандр Міхальчанка. — Аднак яшчэ рана гаварыць пра тое, што тайнае стала яўным. У нашай камісіі наперадзе вялікая работа: у першы дзень мы павінны прыняць справы на ўсе партыйныя кадры, а з КПБ ж былі звязаны не сто і нават не тысяча чалавек.

Святлана КАЛІНКІНА.

«ТРЭБЫ» ТАКСАМА ПАДАРАЖАЛІ

Больш чым у тры разы ўзраслі цэны за паслугі царквы ў Брэсцка - Кобрынскай Епархіі.

Савет Епархіяльнага ўпраўлення ўстанавіў плату за вянчанне — 100 рублёў, пахаванне — 60, хрышчэнне —50. Падаражалі і дробныя «трэбы».

У Савеце Епархіі растлумачылі, што павышэнне цэн — вымушаная мера. Бо царква таксама з'яўляецца гаспадарча - разліковым прадпрыемствам, у якім недапушчальны нават капеечны дэфіцыт бюджэту.

Апошняе слова прапанавана сказаць прыхаджанам. Калі вернікі палічаць падаражанне неапраўданым, Савет Епархіі будзе вымушаны ануляваць сваё рашэнне.

Таццяна ГУСЕВА.
[«Агенцтва РІД»].

КАНКУРЭНЦЫЯ АЎТАСЕРВІСУ

КОБРЫН. **(Ю. Фёдарава).** Яна цяпер існуе ў Кобрынскім раёне. Мясцовы аўтарамзавод спецыялізуецца на рамонце прузавікоў для агракомплексу. Аднак цяпер тут створаны ўчастак і па абнаўленню легкавушак. Прычым гэта даволі буйная вытворчасць. У рамонт будуць прымацца амаль усе маркі асабістых аўтамабіляў грамадзян.

І АБАКРАЛІ, І ПАДПАЛІЛІ

Раніцай, калі людзі ў Талачыне ішлі на работу міма гарсавета, яны ўбачылі, што з памяшкання клубіцца дым, шугае полымя. Пажарныя машыны ўжо залівалі агонь.

Загаранне пачалося ў пакоі інспекцыі па справах непаўналетніх. Пашкоджана мэбля, згарэлі дакументы і асабістыя рэчы супрацоўнікаў. А суткамі раней невядомыя ўчынілі крадзеж дакументаў і маёмасці гарсавета. Дзякуючы апяратыўным дзеянням работнікаў міліцыі і дадамозе насельніцтва затрыманы падазраваемыя ў пажары і крадзяжы, вядзецца следства.

Т. МАХТАДУЯ.

ЗЛАДЗЕІ-ХРЫСЦІЩЕЛІ?

КОБРЫН **(І. Сідарук).** Крывая крадзяжоў уласнай і грамадскай маёмасці няўхільна імкне ўверх і ў правінцыі. Зладзеяў не спыняе нават пагроза Божай кары. Інакш яны не выкралі б тэлефон з сабора св. Аляксандра Неўскага. Ды яшчэ падчас абраду хрышчэння немаўляці. Акрамя святара, бацькоў нованароджанага і іх сваякоў у хрысцільным пакоі больш нікога не было...

ВОГНЕННЫ ВАЛ

АСІПОВІЧЫ **(І. Сцяпура).** Сапраўдны вогненны вал пракаціўся ў мінулую суботу па наваколлю горада. Жыхары мікрараёна № 1 назіралі ззянне: на адлегласці амаль кіламетр, ад гарадской паліклінікі да шашы, гарэлі сухая трава і драбналессе. Моцны вецер гнаў агонь усё ближэй да газанапаўняльнай станцыі. Невядома, што было б, каб не самаадданасць пажарных. Полымя ўдалося спыніць.

КАРЛСАН ТУТ НІ ПРЫ ЧЫМ

З кабінета гарадскога радома № 1 па вуліцы Валадарскага праз незачыненую фортку «вылецелі» два тэлефонныя апараты і аконныя шторы. Такім чынам, верагоднасць апяратыўнага інфармавання многіх шчаслівых бацькоў рэзка зменшылася. А шкада.

Камсамол, вярні людзям грошы!

— часта чуем мы сёння. А сёй-той пазбягае падобных заклікаў і вырашае гэту задачу больш простымі спосабамі.

У міліцыю звярнулася супрацоўніца Кастрычніцкага райкома камсамола, заявіўшы, што візуальна знаёмы ёй мужчына, які жыве ў яе (!) пакоі, украў золата і 4 тысячы рублёў. Мяркуючы па ўсім, злачынца вось-вось будзе затрыманы.

Пікантная, аднак, сітуацыя.

Згубіў талоны — не будзеш пахмялёны

САЛІГОРСК **(М. Лойка).** Ускладняе і без таго нялёгкае жыццё няўважлівым людзям страта талонаў на набыццё тавараў. Як жыць?

Гарвыканком прыняў рашэнне аб выдачы дублікатаў замест згубленых. Адна «загваздка» — за іх трэба плаціць, і нямала. Каб атрымаць, напрыклад, новую прадуктовую картку, трэба аддаць 100 рублёў, прамтаварную — 300, агульнасямейнага карыстання — ажно 500 рублёў. Толькі на лікёра-гарэлачныя талоны дублікаты не будуць выдавацца ні за якія грошы. Так што трэба за кішэнь трымацца, каб пры талонах застацца.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

◆ Старшыня Вярхоўнага Савета Расіі Руслан Хасбулатаў заявіў, што расійскаму ўраду неабходна ісці ў адстаўку. Хасбулатаў выступіў з гэтай заявай на сустрэчы ў Маскве з італьянскімі парламентарыямі. Адстаўку ўрада павінен прыняць альбо прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын, альбо парламент краіны. Хасбулатаў сказаў, што Ельцыну неабходна адмежавацца ад цяперашняга ўрада, які па яго словах не толькі не эфектыўны, але і недастаткова кваліфікаваны. Ельцын і ўрад Расіі падвяргаюцца крытыцы за праводзімыя імі эканамічныя рэформы, у прыватнасці — па лібералізацыі цэн, якая прывяла да рэзкага павышэння кошту жыцця.

◆ **Першы віцэ-прэм'ер Расіі Генадзь Бурбуліс падвергнуў крытыцы ўрад Украіны за ўвядзенне ў рэспубліцы спецыяльных купонаў паралельна з грашыма. Гэта мера, на яго думку, можа прывесці да ўзмацнення эканамічнага крызісу ў іншых рэспубліках, у прыватнасці, выкліча рэзкае павышэнне інфляцыі. Бурбуліс таксама заявіў, што Расія імкнецца пазбегнуць эканамічнай канфрантацыі з Украінай.**

◆ Прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук адзначыў паляпшэнне адносін з Расіяй. Абодва бакі, сказаў ён, павінны адносіцца адзін да аднаго як да роўнага партнёра.

РАДЫЁ «ФРАНС ІНТЭРНАСЬЯНАЛЬ [RFI]»

◆ **У Расіі ўзнікла новая партыя — Руская партыя нацыянальнага адраджэння. Мэта яе — адраджэнне рускай нацыі і захаванне непадзельнай Расіі.**

◆ Аман і Азербайджан падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне паставак нафты.

◆ **На вуліцах алжырскай сталіцы па-ранейшаму знаходзяцца войскі. Вышэйшы савет бяспекі алжырскага ўрада і камандуючы ўзброенымі сіламі заявілі, што яны ўзялі на сябе адказнасць па падтрыманню грамадскага парадку ў краіне да таго часу, пакуль будзе знойдзены выхад з палітычнага крызісу. Савет засядае няспынна і ён, мяркуючы па ўсім, валодае сітуацыяй.**

БІ-БІ-СІ

◆ Некаторыя прадукты харчавання ў Маскве падаражалі ў дзесяць разоў. Як адзначае карэспандэнт Бі-Бі-Сі, настрой людзей набліжаецца да крытычнай кропкі, пагражае выбухам.

◆ **Ватыкан услед за Германіяй афіцыйна прызнаў незалежнасць Славеніі і Харватыі. Прадстаўнік Ватыкана выказаў надзею, што гэты крок прынясе мір на Балканы. Ён падкрэсліў, што гэта зусім не з'яўляецца варожым жэстам у адносінах да Бялграда. Дыпламатычны карэспандэнт Бі-Бі-Сі цытуе брытанскія крыніцы, указваючы, што іншыя краіны еўрапейскай супольнасці верагодней за ўсё аб'явяць у сераду аб тым, што і яны прызнаюць Харватыю і Славенію ў якасці незалежных дзяржаў. У сераду заканчваецца ўстаноўлены еўрапейскім супольніцтвам тэрмін для прыняцця падобнага рашэння. Пытанні распаду Югаславіі і ролі міжнародных міратворчых сіл абмяркоўваліся і на сустрэчы ў Лондане Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Бутраса Галі з брытанскімі лідэрамі.**

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

◆ У Вашынгтоне пачаўся трэці раунд перагавораў па ўрэгуляванню праблем Блізкага Усходу. Ёсць надзея на тое, што працэдурныя рознагалоссі, якія заштопарылі папярэднія раунды, будуць пераадолены.

◆ **Міністр абароны Злучаных Штатаў Амерыкі Рычард Чэйні вёў у Боне перагаворы з міністрам абароны Германіі Герхардам Штольтэнбергам. У час знаходжання ў Германіі Чэйні сустрэнецца таксама з канцлерам Гельмутам Колем. У парадку дня перагавораў— пытанні бяспекі і развіцця падзей у Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

◆ Польскія рабочыя правялі сімвалічныя аднагадзінныя забастоўкі, адгукнуўшыся на заклік да дзеяння прафсаюзнага аб'яднання «Салідарнасць». Гэта стала іх адказам на павышэнне кошту электраэнергіі, аб чым паведаміў урад краіны. «Салідарнасць» заяўляе, што заклік да забастоўкі атрымаў шырокую падтрымку. Па словах прэзідэнта Польшчы Леха Валенсы, забастоўка павінна спрыяць прыняццю больш разумнай эканамічнай праграмы.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

КОЛЬКІ КАШТУЕ КІЛАВАТ?

Што адбываецца з нашай энергетыкай? Няўжо і сапраўды ў асобных рэгіёнах Беларусі існуе рэальная пагроза застацца ў кватэры без цяпла і са свечкай? На гэтыя і іншыя пытанні чытачоў «Звязды» мы папрасілі адказаць намесніка генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання «Гроднаэнерга» Аляксандра Іванавіча ЧУМАЧЭНКУ.

У энергетыцы рэспублікі і, у прыватнасці, Гродзеншчыны нічога экстраардынарнага не адбылося, хоць мы трапілі ў даволі складанае становішча. Аднак яно не катастрафічнае. Нам трэба належным чынам настроіць спажыўцоў энергіі, наладзіць работу энергетычных аб'ектаў.

Энергетыкі да зімы падрыхтаваліся — адрамантавалі абсталяванне, правялі яго выпрабаванні. Але значную частку электраэнергіі мы атрымліваем з іншых рэгіёнаў. Цяпер будуецца лінія Смаленск—Мінск, каб у пэўнай меры вырашыць праблему дэфіцыту энергіі. Энергетыкі кінулі туды ўсю тэхніку, у тым ліку і з Гродзеншчыны, — гэта ж наша агульная справа.

Што датычыць непасрэдна Гродзеншчыны, дык яна атрымлівае з іншых рэгіёнаў ажно 80 працэнтаў энергіі. І толькі пятая частка яе выпрацоўваецца на Гродзенскай ЦЭЦ-2, на Лідскай ЦЭЦ і некаторых маленькіх ГЭС. Ужо не першы год ідзе будаўніцтва Зэльвенскай электрастанцыі, якая будзе працаваць на газе і поўнасцю задаволіць патрэбнасці вобласці да 2010 года. Зможам забяспечваць энергіяй і іншыя рэгіёны рэспублікі. Цяпер вядзецца тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне будоўлі, у лепшым выпадку пуск першага блока адбудзецца ў 1998 годзе. А пакуль што нам трэба будаваць мабільныя газатурбінныя станцыі. Магчымасці для гэтага ёсць у Смаргоні, Лідзе, Слоніме. У чым каштоўнасць такіх станцый? Справа ў тым, што сёння ўся прамысловасць хоча пазбавіцца ад начных змен, і пік нагрузкі падае на дзень і вечар. У гэтыя перыяды энергетычных магутнасцей не хапае. Вось тут і адыгралі б сваю ролю газатурбінныя станцыі, якія можна апяратыўна ўключаць у работу і спыняць у залежнасці ад патрэбы. Праўда, такія станцыі трэба будаваць за кошт сродкаў саміх спажыўцоў энергіі. Гэта абыдзецца нятанна, але аўчынка варта вырабу.

— Ці будуць у сувязі з недахопам электраэнергіі ўносіцца нейкія карэктывы ў графікі работы яе спажыўцоў?

— Мы распрацавалі і ўзгаднілі з мясцовымі ўладамі графікі абмежаванняў і адключэнняў электраэнергіі ад тых ці іншых спажыўцоў. Усё скіравана на тое, каб выкарыстоўваць энергію толькі рацыянальна. Ну а калі і гэта не дапаможа, у нас ёсць так званы графік «Вязрок», у адпаведнасці з якім мы будзем на 30—40 мінут адключаць усе населеныя пункты і нават цэлыя раёны, каб не разваліць энергасістэму. Бо калі развалім — катастрофа.

Для панікі, падкрэслю, ніякіх падстаў няма. Аднак трэба добра ўсвядоміць, як дорага можа каштаваць безгаспадарчасць, абыякавасць. І таму яшчэ раз звяртаюся да кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў: калі ёсць магчымасць працаваць у начную змену, калі ласка, перабудоўвайцеся.

Вы спытаеце: а ці залежыць нешта ад звычайнай сям'і? Залежыць, і вельмі шмат. Мяркуйце самі. Па тэлебачанні выступаў кіраўнік «Беларусьэнерга» і папрасіў тэлегледачоў на пяць мінут выключыць з кватэрах непатрэбнае асвятленне. У выніку мы атрымалі эканомію 104 тысячы кілават, у тым ліку 20 тысяч — па Гродзеншчыне. Многа гэта ці мала? 20 тысяч кілават дастаткова для нармальнай работы аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў абласнога цэнтра — прадзільна-нітачнага аб'яднання. (На наступны дзень пасля гэтай гутаркі А. Чумачэнка, выступаючы па абласным тэлебачанні, паўтарыў падобны эксперымент. І зноў ашаламляльныя вынікі! Нагрузкі, якая эканомілася пасля адключэння непатрэбнага асвятлення, хапіла б для нармальнага энергазабеспячэння адразу некалькіх раёнаў Гродзеншчыны.)

— Аляксандр Іванавіч, як ставяцца да адзінай энергетычнай сістэмы былога СССР нашы суседзі-літоўцы?

— Наколькі мне вядома, яны не жадаюць уваходзіць у адзіную энергасістэму. Маўляў, мы — незалежная дзяржава, і давайце гандляваць энергіяй ужо ў перавадных рублях ці свабодна канверсуемай валюце. І так сапраўды будзе, калі Расія пачне разлічвацца з літоўцамі па сусветных цэнах.

— А як раптам Расія і іншыя суседнія дзяржавы прад'явяць Беларусі значна больш жорсткія ўмовы для разліку за электраэнергію? Гэта для нас катастрофа?

— Не. Сёння электраэнергія ў параўнанні з Захадам у нас вельмі і вельмі танная. Праўда, сабекошт гэтага кілавата на Гродзеншчыне большы, бо ў Літвы яго купляем значна даражэй.

— Ці ёсць адносна цэн нейкія гаранты з боку іншых рэспублік, адкуль мы атрымліваем энергію і сыравіну для яе вытворчасці?

— Я не валодаю ў поўным аб'ёме гэтай інфармацыяй. Аднак перакананы ў галоўным: сёння нам трэба вельмі самакрытычна і прынцыпова падысці да ўласнай энергетычнай палітыкі. З іншага боку, трэба ўсё зрабіць для таго, каб не разбурыць адзіную энергетычную сістэму. Як бы ні склаліся палітычныя адносіны паміж рэспублікамі — калі не міністэрства энергетыкі, дык адзінае саюзнае дыспетчарскае ўпраўленне энергетыкай павінна быць абавязкова.

Гутарку вёў
Барыс ПРАКОПЧЫК,
кар. «Звязды».

ДЗЁМІН Іван Міхайлавіч

13 студзеня 1992 г. на 78-м годзе жыцця памёр былы генеральны дырэктар Беларускага аб'яднання па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, персанальны пенсіянер саюзнага значэння Дзёмін Іван Міхайлавіч.

І. М. Дзёмін нарадзіўся 2 студзеня 1915 г. у в. Хацісіна Перамышльскага раёна Калужскай вобласці ў сялянскай сям'і. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1931 годзе эканамістам у г. Маскве. У 1941 годзе закончыў Маскоўскі тэкстыльны інстытут. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў рады дзеючай арміі, а з 1942 года быў камандзірам партызанскага атрада імя Кутузава брыгады «Смерць фашызму».

З верасня 1944 г. да выхаду на пенсію І. М. Дзёмін нязменна працаваў на Мінскім аўтамабільным заводзе. Працаваў намеснікам галоўнага энергетыка, галоўным энергетыкам, дырэктарам завода, генеральным дырэктарам Беларускага аб'яднання па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў.

На ўсіх участках гаспадарчай дзейнасці І. М. Дзёмін зарэкамендаваў сябе вопытным арганізатарам вытворчасці, высокакваліфікаваным спецыялістам. Яго вызначалі высокая прынцыповасць, дзелавітасць, уважлівыя і чулыя адносіны да людзей. Амаль 40 гадоў сваёй працоўнай дзейнасці І. М. Дзёмін аддаў стварэнню і развіццю аўтамабільнай галіны рэспублікі і ўсяго айчыннага аўтамабілебудавання. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР шостага і дзесятага скліканняў, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

Баявыя і працоўныя заслугі І. М. Дзёміна адзначаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, многімі медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Светлая памяць аб Іване Міхайлавічу Дзёміне — таленавітым арганізатару, цудоўным чалавеку назаўсёды захаваецца ў сэрцах усіх, хто ведаў яго і працаваў разам з ім.

С. С. Шушкевіч, В. Ф. Кебіч, В. І. Шаладонаў, М. У. Мясникові, С. В. Брыль, М. І. Дзямчук, У. А. Заламай, І. А. Кенік. М. М. Косцікаў, У. С. Пілюта, А. А. Шахновіч, У. І. Куранкоў, А. М. Герасіменка, М. Ф. Лаўрыновіч.

Хто папросіць прабачэння ў Фёдаравай,

або Пра абмен грошай, палітыку ўлад і гуманізм

Праз месяц споўніцца гадавіна апублікавання і выканання надзвычайнага, нечаканага, як і многае іншае за гады перабудовы, Указа Прэзідэнта СССР «Аб спыненні прыёму да плацяжу грашовых знакаў Дзяржбанка СССР вартасцю 50 і 100 рублёў узору 1961 года і абмежаванні выдачы наяўных грошай з укладаў грамадзян».

Здавалася б, нашы людзі ўжо забыліся пра гэтыя страшныя тры дні. Але гэта тыя, каму пашанцавала, хто не сустрэў абыякавых чыноўнікаў, якія вырашалі лёс чужых грошай. Мне, як старшыні камісіі пры абласным Савеце народных дэпутатаў на грамадскіх асновах, давялося бачыць разгубленасць і гора многіх грамадзян, якія ніяк не маглі зразумець, чаму зароблены імі працай і зберажонымі сродкамі так самавольна мог распарадзіцца і нават адняць чыноўнік ад імя Прэзідэнта. Людзям даводзілася ўніжацца, прасіць, траціць свой асабісты час, нярэдка ездзіць з раённых цэнтраў у абласны, каб на нашай камісіі адстаяць сваё права на сваю ж уласнасць... Яшчэ і сёння да нас звяртаюцца людзі з просьбамі абмяняць дзесьці прыхаваныя на «чорны дзень» 100 ці 200 рублёў. Іх знаходзяць то за шпалерамі, то ў шафе, то ў пасцельнай бялізне. А многія прыносілі гэтыя грошы пасля смерці старых людзей, якія не маглі паверыць, што нехта мог зрабіць замах на іх бедныя зберажэнні.

Члены абласной камісіі стараліся аб'ектыўна і спагадліва ставіцца да людзей, правы якіх, гарантаваныя дзяржавай, былі проста парушаны. Тым не менш застаўся вельмі непрыемны асадак ад усяго гэтага, і калі здаралася, настаў канец чарговаму мерапрыемству перабудовы, да мяне, як старшыні, звярнулася грамадзянка Л. Фёдарава з просьбай абараніць яе чалавечую годнасць і гонар калектыву.

23 студзеня 1991 года, працуючы загадчыцай магазіна № 10 г. Магілёва, Л. Фёдарава здала 120 тысяч 800 рублёў гандлёвай выручкі, якая значна перавышала сярэднедзённую. Вось тут і пачалося. Прэса абрушылася з выкрывальнымі артыкуламі і катэгарычнымі заключэннямі ў адрас Фёдаравай і калектыву магазіна: праз тры дні выносіць прыгавор «Магілёўская праўда» (26.01.91 г.), праз два месяцы — газета «Могилевские ведомости» (25 красавіка), а 14 чэрвеня — газета «На страже Октября». І нават самая справядлівая. «Труд» спрабавала ўнесці свой уклад. Уключыліся пракуратура, БКСУ, нават КДБ. З абароту гарпрамгандлю і магазіна былі ўзяты 120 тысяч рублёў, прадаўцы, а іх 12 чалавек, пазбавіліся не толькі прэмій, але і заработнай платы. І гэта пры тым, што калектыў лічыўся ўзорным, неаднаразова заахвочваўся Міністэрствам гандлю і гарпрамгандлем. Ніхто нічога не прымаў у разлік, трэба было знайсці, як у нас заўсёды знаходзілі і абвінавачвалі без суда і следства, «вядзьмарак».

Некалькі месяцаў назад, калі паўстала пытанне аб вяртанні грошай калектыву, я падтрымаў гэта. Па-першае, ні адзін жулік ці злодзей не панясе ў банк тое, што ён несумленна нажыў; па-другое, гэта не асабістыя грошы, а гандлёвая выручка; а па-трэцяе, калі рэвізія магазіна выявіць факт крадзяжу ці парушэння правіл гандлю, то ўсё павінна рабіцца ва ўстаноўленым законам парадку, а не шляхам выдумак і здагадак.

Л. Фёдарава прад'яўляе мне заключэнне пракуратуры Магілёўскай вобласці ад 24.10.91 г. № 15-6-91, дзе сказана: «У ходзе расследавання справы ўстаноўлена, што буйная сума грошай у загадчыцы магазіна № 10 Фёдаравай Л. І. утварылася ў выніку нясвоечасовай здачы грашовай выручкі». Адным словам, фактаў злоўжывання не ўстаноўлена. У выніку гэтага пералічаныя на рахунак № 904 грошы (прынятыя ў банк ад Л. Фёдаравай) з'яўляюцца дзённай выручкай магазіна і належаць залічэнню на рахунак гарпрамгандлю.

Здавалася б, на гэтым можна ставіць кропку, але хто папросіць прабачэння ў Л. Фёдаравай, хто верне страты за 10 месяцаў? Напэўна, у прававой дзяржаве, устанавіўшы невінаватасць ці агавор, кампраметацыю чалавека, называюць яго суддзяў, у тым ліку і аўтараў артыкулаў, патрабуюць матэрыяльную кампенсацыю за падрыў не толькі аўтарытэту, але і здароўя чалавека.

Не ведаю, колькі яшчэ выпрабаванняў чакае нашых людзей, што яшчэ прыдумаюць на іх галовы кіраўнікі, але вельмі хацелася б верыць, што іх не будуць узрушаць маральныя і псіхалагічныя стрэсы ад рэформ ды эксперыментаў. Хацелася б верыць, што зразумеем нарэшце: самае каштоўнае — гэта людзі, і пра іх трэба думаць усім уладам — заканадаўчай, выканаўчай, судовай. Ды і прэсе, безумоўна. Але верыцца з цяжкасцю. Напрыклад, ужо сёння людзі задаюць пытанне: чаму, скажам, кватэра, якая яшчэ ўчора каштавала 5 тысяч рублёў, сёння — 15 і невядома, якую цану ёй прызначыць улада заўтра? Хоць зберажэнні людзей і іх даходы не павялічваюцца ў той жа прапорцыі, якую ўстанаўліваюць чыноўнікі ад імя дзяржавы на кошт нерухомасці. Ці чаму перш чым аб'явіць курс падзення рубля па прычыне росту цэн, дзяржава не аб'яўляе ўзроўню індэксацыі зберажэнняў, які гарантуе іх захаванасць? Хіба могуць людзі ў такім разе з павагай адносіцца да сваёй дзяржавы ў асобе існуючай улады? І якая ім розніца, як называюць сябе тыя, хто ўладарыць, — дэмакратамі, сацыялістамі ці камуністамі? Галоўнае для народа, каб спыніліся эксперыменты на яго лёсе і, нарэшце, з'явілася сацыяльна справядлівая дзяржава. Каб пазначана яна была сапраўдным гуманізмам. Толькі тады ў людзей з'явіцца ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

С. КРУТАЎЦОЎ,
дэпутат Магілёўскага абласнога Савета.

Рэлігійныя святы 1992 года

Вось ужо адсвяткавалі і «стары» Новы год. Будуць наперадзе і яшчэ святы — дзяржаўныя і рэлігійныя. Наконт апошніх, дарэчы, да гэтага часу чуюцца званкі ў рэдакцыю: не ўсе ведаюць святочныя даты. Нагадваем для вернікаў рэспублікі поўны каляндар святочных дат на 1992 год.

Праваслаўныя і стараверскія

7 студзеня — Каляды
19 студзеня — Хрышчэнне
15 лютага — Грамніцы
7 красавіка — Благавешчанне
19 красавіка — Вербная нядзеля
26 красавіка—Вялікдзень
5 мая — Радаўніца
4 чэрвеня — Ушэсце
14 чэрвеня — Тройца
15 чэрвеня — Духаў дзень
12 ліпеня — Дзень Пятра і Паўла
19 жніўня — Узвіжанне
28 жніўня — Прачыстая
21 верасня — Нараджэнне Багародзіцы
27 верасня — Узвіжанне
14 кастрычніка — Пакровы
4 снежня — Увядзенне ў храм Багародзіцы

Каталіцкія

25 снежня — Каляды
6 студзеня — Хрышчэнне
2 лютага — Грамніцы
25 сакавіка — Благавешчанне
12 красавіка — Вербная нядзеля
19 красавіка — Вялікдзень
28 мая — Ушэсце
7 чэрвеня— Зялёныя свёнткі
14 чэрвеня — Тройца
29 чэрвеня — Дзень Пятра і Паўла
6 жніўня — Узвіжанне
15 жніўня — Прачыстая
8 верасня — Нараджэнне Багародзіцы
14 верасня — Узвіжанне
1 лістапада — Дзень усіх святых
2 лістапада — Дзень задушны
22 лістапада — Урачыстасць Хрыста—цара Сусвету

Пратэстанцкія

7 студзеня — Каляды
19 студзеня — Хрышчэнне
15 лютага — Грамніцы
7 красавіка — Благавешчанне
19 красавіка — Вербная нядзеля
26 красавіка — Вялікдзень
4 чэрвеня — Ушэсце
14 чэрвеня — Тройца
19 жніўня — Узвіжанне
27 верасня—Свята жніва.

Іудзейскія

19 сакавіка — Пурым
18 красавіка—Вялікдзень
7 чэрвеня — Тройца (шавуэс)
28 верасня — Рош-Амана
7 кастрычніка — Іом-Кіпур (Судны дзень)
12 кастрычніка — Сукот (кушчы)
20 кастрычніка — Сімхас-Тора
20 снежня — Ханука

Мусульманскія

20—21 верасня — Каляды (Маулід)
4 сакавіка — Першы дзень рамазана (паста)
4 красавіка — Ураза-Байрам (разгавенне)
10—12 чэрвеня — Курбан-Байрам (ахвяраванне)
13 ліпеня — Хіджра (Новы год)

Усе хваробы—ад яды

Сёння з вамі гутарыць Клара Азорніна

ВАША ЗДАРОЎЕ

Кажуць, быццам усе хваробы — ад нерваў. Нічога падобнага! Большасць нашых хвароб перш за ўсё звязаны з варварскімі адносінамі людзей да свайго харчавання. Амаль у кожнай сям'і існуюць свае, калі можна так сказаць, асаблівыя традыцыі ў адносінах да яды. Прычым многія мяркуюць: чым больш багатае, разнастайнае харчаванне — тым лепш. Асабліва гэта правіла распаўсюджваецца на дзяцей. Бацькі, пазбаўляючы сябе дарагіх і дэфіцытных прадуктаў, імкнуцца накарміць імі дзяцей, тым самым ужо з ранняга ўзросту парушаюць у іх дзейнасць страўнікава - кішэчнага тракта.

Пры гэтым адпрацаваныя прадукты выводзяцца з арганізма нерэгулярна, і зваротнае ядаў і шлакаў у кроў атручвае яе. Тут карысна нагадаць, што ў нованароджаных арганізм спрацоўвае пасля кожнага прыёму ежы. Аднак гэты цудоўны прыродны рэфлекс «забіваюць» няправільным шчодрым кармленнем. Ядзім мы, як правіла, тры разы ў дзень, а кішэчнік вызваляем адзін раз, а то і наогул праз дзень. А нявыведзеная своечасова ежа, як ужо гаварылася, абарочваецца самаатручэннем арганізма і прыводзіць да розных хвароб.

Прывяду такі прыклад. Некаторыя людзі гадамі пакутуюць ад малакроўя. Ядуць у вялікай колькасці яблыкі, мяса, печань, а гемаглабін калі і нармалізуецца, дык ненадоўга. Але варта толькі павысіць хворым функцыю страўніка, гэта значыць звесці да мінімуму асартымент прадуктаў, аж да монадыеты (капусная ці крупяной)—хваробу як рукой здыме. Атрымліваецца, малакроўе ўзнікае не ад недахвату мікраэлементаў, у прыватнасці жалеза, а ад няздольнасці органаў стрававання атрымліваць ці выпрацоўваць яго з прадуктаў.

Запомніце: нельга есці ўсё без разбору! Як усё жывое на Зямлі мае станоўчы ці адмоўны патэнцыял, так і ежа. На Усходзе яе падраздзяляюць на «Янь» — і «Інь» — прадукты. Да першых, што нясуць станоўчы зарад энергіі, адносяцца ўсе крупы, хлеб, кукуруза, кава, чай, малако, цыбуля, часнок, усе перцы, соль, бульба, грыбы, морква, баклажаны, буракі, гарчыца, лаўровы ліст, кроп, яечны бялок. Да другіх — капуста, кабачкі, мёд, усе ягады, салодкае (у тым ліку шакалад), спіртное, яечны жаўток, мяса, рыба, птушка, алей, арэхі, усе фрукты, кіндза, пятрушка, таматны соус, яблычны воцат. Як вы ўжо здагадаліся, у краінах старажытнага Усходу ежа адной групы ніколі не змешвалася з другой. Прычым людзям, валодаючым «Янь» — энергіяй, рэкамендавалася ўжываць «Інь» — прадукты, тым жа, каму ўласцівая «Інь»— энергія, насупраць — «Янь» — прадукты.

ЗАМЕЖЖА

ЧСФР. Камісія па стандартах пры Міжнароднай кінералагічнай федэрацыі афіцыяльна прызнала новую пароду сабак, выведзеную ў Чэха-Славакіі. «Чэшскі горны сабака» атрыманы ад канадскага ездавога і малавядомага за межамі сваёй радзімы славацкага чувача ў выніку селекцыйнай работы, якая працягвалася 15 гадоў. Новыя «лепшыя сябры чалавека» маюць доўгую поўсць, белую афарбоўку з цёмнымі плямамі.

Людзі ідуць па свеце

ПОРТ-ЛУІ. За мінулы год на Маўрыкіі пабывала 305 тысяч зарубежных турыстаў — на 23 тысячы больш, чым за ўвесь мінулы год. Турызм у гэтай невялікай астраўной дзяржаве, размешчанай у паўднёва-заходняй частцы Індыйскага акіяна, ужо некалькі гадоў трывала ўтрымлівае трэцяе месца па паступленнях у казну — пасля даходаў ад экспарту цукровага трысняга і прадукцыі прадпрыемстваў «свабоднай экспартнай зоны».

Амаль кожны другі турыст прыбывае на Маўрыкій з Францыі. Многа тут і падарожнікаў з ПАР, а таксама ФРГ, Вялікабрытаніі і іншых краін Еўропы.

Улады Маўрыкія разлічваюць да 2000 года штогод прымаць да 400 тысяч гасцей з-за рубяжа.

Ці можна з'есці натхненне!

КАІР. «Пакіньце нам газель — крыніцу натхнення», — з такім заклікам звярнулася да грамадскасці праз газету «Аль-Гумхурыя» група егіпецкіх паэтаў. Але няправільна было б думаць, што мастакоў слова хтосьці збіраецца пазбавіць адной з паэтычных форм — кароткага лірычнага твора, вядомага пад назвай газель. Гаворка аб зусім матэрыяльным парнакапытным, якое жыве ў пустынях Егіпта.

Газель, якая некалі была самай распаўсюджанай тут жывёлінай, цяпер блізкая да таго, каб аказацца ў «Чырвонай кнізе». Прычынай стала не толькі асваенне пустынь, але і шматлікія «сафары» з удзелам замежных турыстаў-паляўнічых.

У вядомым каірскім заапарку зладзеі ўкралі апошні экземпляр гэтай жывёліны. На думку служыцеляў заапарку, выкрадальнікі былі галоднымі і хацелі наесціся мяса.

Па матэрыялах інфармацыйных агенцтваў і друку.

ЗОНА АСАБЛІВАЙ УВАГІ

«ПАТРЫЁТЫ» ШТУРМУЮЦЬ ІЛЬГОТЫ

У аддзеле для льготнікаў, які існуе ў мінскім ЦУМе, выпадкова сустрэў старога знаёмага: той скручваў у рулон толькі што куплены шыкоўны дыван.

— Тры тысячы ўбухаў! — з гордасцю паведаміў ён.— Нядаўна ў чаргу на халадзільнік запісаўся. Кажуць, праз квартал атрымаю. А там і «сценка» падыдзе.

— А як ты трапіў у льготнікі? — пацікавіўся я. — У Афганістане ж, здаецца, не ваяваў?

— Ен жа ў мяне лі-кві-датар! — гучна засведчыла яго жонка.— У зоне працаваў.

— І як доўга?

— А я ўжо не памятаю.

А я ўспомніў. Гэта было вясной 1987 года. Жора (назавём яго так) прабраўся да мяне ў перапоўненым аўтобусе.

— Ваенкамат зусім замучыў, — цяжка ўздыхнуў ён,— у Чарнобыль вырашылі паслаць. Цэлы тыдзень дома не начую... Знайшлі дурня!

І вось Жора — патрыёт-ліквідатар. Мае адпаведнае пасведчанне, карыстаецца льготамі: ездзіць бясплатна ў гарадскім і прыгарадным транспарце, атрымлівае спецпайкі, за кошт дзяржавы адпачывае на цёплым і чыстым моры... За якія заслугі? Жора чатыры дні правёў у Хойніках. Чатыры дні з дарогаю туды і назад.

Колькі ў нас такіх «ліквідатараў»? На гэта пытанне я папрасіў адказаць кіраўніка спраў Першамайскага райсавета народных дэпутатаў Мінска А. Капусту.

— За ўсю рэспубліку сказаць не магу,— Анатоль Уладзіміравіч дастаў з шуфляды патрэбную паперыну,— а вось у нашым раёне такіх асоб некалькі дзесяткаў набярэцца. Усё законна! Прадставіў чалавек адпаведную даведку, засведчаную гербавай пячаткай, — мы абавязаны выдаць пасведчанне.

Мой субяседнік змоўк, паглядзеў за акно.

— Канешне, незаслужана прыраўнялі тых, хто прабыў у зоне паўгода, з тымі, хто з'явіўся там наскокам,— працягваў гаспадар кабінета. — Скажам, вадзіцель адвёз свайго шэфа ў Нароўлю, а праз два дні забраў яго адтуль — сёння ён патрабуе пасведчанне ліквідатара. У верасні мінулага года Дзяржкамчарнобыль часова прыпыніў выдачу дакументаў, а як будзе далей — пакуль што невядома.

У іншых раёнах, дзе давялося пабываць у апошні час,— карціна такая ж. Запаветныя пасведчанні атрымалі многія найбольш спрытныя прафсаюзныя і камсамольскія актывісты, кіраўнікі розных рангаў з міністэрстваў і ведамстваў, журналісты, былыя партыйныя работнікі. Наўмысна не называю іх прозвішчаў. І вось чаму. Вучоныя яшчэ не абгрунтавалі ступень уздзеяння малых доз радыяцыі на здароўе чалавека.

У 1988 годзе мяне прызвалі на спецзборы «для выканання адказнага задання савецкага ўрада». У Хойніцкім, Брагінскім і Веткаўскім раёнах прабыў паўгода. Неяк задумаўся: чаму ў палку служаць у асноўным прадстаўнікі слаўнага рабочага класа і калгаснага сялянства? А ці трапляюць сюды таварышы з наменклатурнай абоймы? Сякі-такі доступ да дакументаў меў, дапамаглі таксама саслужыўцы са штаба. Праглядзелі спісы асабовага саставу часці за 1987—88 гады. Пошукі аказаліся безвыніковымі. Сустрэлі некалькі дзесяткаў прозвішчаў спецыялістаў народнай гаспадаркі, настаўнікаў, медыкаў.

Крыху пазней афіцэр Першамайскага райваенкамата Мікалай Осіпаў растлумачыў:

— Думаеш, што мы не прызывалі афіцэраў запасу, якія займалі кіруючыя пасады? Прызывалі! Не раз пасыльныя прыносілі ім павесткі. Але назаўтра на стол ваенкома клалі хадайніцтва, сэнс якога наступны: калі возьмеце на зборы (імярэк), арганізацыя, прадпрыемства, а то і горад перастануць існаваць. Я ўжо не кажу пра даведкі накшталт такіх: вызваліце ад збораў у сувязі з хваробай цешчы ці замежнай камандзіроўкай. Зазірні ў ваенны камісарыят рэспублікі — і там шмат такіх дакументаў пакажуць.

Вось так: калі Радзіма прасіла дапамогі — у кусты, а калі ад яе можна ўварваць тлусты кавалак — мы тут першыя. Хачу, каб мяне правільна зразумелі: я не супраць ільгот, якімі карыстаюцца зараз тыя, хто па сваёй волі ці па волі начальства аказаўся ў небяспечных дні ў пацярпеўшых раёнах. Я — за тое, каб усё ж аддаць, як кажуць, Богу Богава, а ліквідатару ліквідатарава. На жаль, у Законе Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» многае ўпушчана. Можна толькі здагадвацца — чаму? Спашлюся на артыкул 13 другога раздзела.

Згодна з ім, ліквідатарамі з'яўляюцца грамадзяне, якія «прымалі ўдзел у работах па ліквідацыі вынікаў катастрофы на ЧАЭС у 1986—1987 гадах у межах зоны эвакуацыі, ці занятыя ў гэты перыяд на эксплуатацыі ці іншых работах на ўказанай станцыі **(у тым ліку часова накіраваныя ці камандзіраваныя)**...» Апошнія словы падкрэслены мною невыпадкова. Што значыць часова? Дзень, тыдзень, месяц? Гэта па-першае. Па-другое, тут не агаворана ступень удзелу ў ліквідацыі. Скажам, хто больш рызыкаваў здароўем: начальнік у легкавушцы, які «аглядаў» мёртвыя вёскі ці выступаў у раённым доме культуры, альбо рабочы брэсцкага «Газаапарата», што лазіў па стрэхах хат, нашпігаваных атрутай?

Тое самае і з ліквідатарамі 1988 года. Дарэчы, гэта катэгорыя, па-мойму, незаслужана пакрыўджана. Мяркуйце самі. Начальнік ці яго вадзіцель пабывалі ў зоне 25—29 снежня 1987 года. Калгаснік з Мядзельшчыны шэсць месяцаў 1988 года займаўся дэзактывацыяй населеных пунктаў, будаўніцтвам агароджы Палескага экалагічнага запаведніка, зіму правёў у палатцы, з ранку да вечара знаходзіўся на забруджанай тэрыторыі. Скажыце, калі ласка, хто з іх больш апрамяняўся: начальнік з вадзіцелем ці калгаснік? Несумненна, апошні. А вось ільготы у іх розныя. Першыя рашэннем Мінфіна рэспублікі нават падаходным падаткам не абкладваюцца. А другія не маюць права стаць у льготную чаргу...

Пішу аб гэтым і лаўлю сябе на думцы: можа, адмяніць усе гэтыя льготы, а сродкі накіраваць тым, хто ляжыць пад кропельніцай у «Аксакаўшчыне», хто чакае — не дачакаецца перасялення, тым кволым бабулькам з зоны, якія выстойваюць гадзінамі ля сельскай крамы, каб купіць звычайныя пакаёвыя пантофлі — на смерць... Пішу і чую голас свайго ўяўнага апанента: ты выступаеш супраць закона, які прыняў парламент рэспублікі. Не, я — за закон! Але такі, кожны пункт і раздзел якога не выклікалі б супярэчлівых думак і пачуццяў.

Як вядома, усе кампенсацыі чарнобыльцам павінны выплачвацца за кошт фонду заработнай платы прадпрыемстваў, арганізацый, калгасаў, саўгасаў і г. д. І натуральна, прадпрыемствы ўсяляк імкнуцца пазбавіцца ад ліквідатараў, адмаўляюць ім у працаўладкаванні. А калі і выплачваюць кампенсацыю, то абдзіраюць, як ліпку. Зразумець такую пазіцыю няцяжка: чаму калектывы павінны плаціць свае кроўныя за галавацяпства тых, хто ўчыніў трагедыю?

І апошняе. Чытач можа падумаць, што артыкул напісаны з кан'юнктурных меркаванняў: аўтару зайздросна, што на яго не распаўсюджваюцца льготы ліквідатараў першых постчарнобыльскіх гадоў. Паверце, не зайздрошчу. Думаю аб сотнях «партызан» так званага Беларускага палка, якія сумленна выканалі свой грамадзянскі абавязак. А што датычыцца мяне асабіста... У чэрвені 1986 года я тры дні знаходзіўся ў Нараўлянскім і Мазырскім раёнах, у жніўні столькі ж часу — у Чэрыкаўскім, у верасні — у Касцюковіцкім. За 1987 год пабываў ў камандзіроўках у Чачэрскім, Кармянскім, Чавускім раёнах. Праўда, па журналісцкіх справах. Але клапаціцца пра пасведчанне на льготы, дыканы і шыкоўную мэблю забаранае адно: цяжкія, горкія сустрэчы з людзьмі, якіх страшная бяда спасцігла не ў камандзіроўцы, не ў кароткатэрміновым наездзе, а там, дзе яны жылі і, што самае жудаснае,— жывуць. І як быць з тымі, хто ехаў у тыя дні ў Хойнікі, Брагін, Ветку, Краснаполле не ў камандзіроўку, а — дадому, з трывогай і болем за бацькоў, за родных? І ніхто ж не адмяняў спрадвечнага сялянскага клопату — узараць поле, пасадзіць бульбу...

Які ўраджай збяром мы з душаў, што засяваліся раўнадушшам, няшчырасцю?

Уладзімір БАЦКАЛЕВІЧ.

Усё большую папулярнасць заваёўвае ў маладых брастаўчан барацьба дзю-до. Гэтым відам спорту сур'ёзна захапляюцца ў брэсцкай ДЮСШ № 7 звыш 200 пачынаючых спартсменаў, трыццаць з іх — прадстаўніцы «слабага» полу. Дзяўчаты ўнеслі ў агульную скарбонку медалёў брэсцкіх барцоў і сваю долю пераможных баёў.

НА ЗДЫМКУ: на трэніроўцы кандыдаты ў майстры спорту студэнтка Брэсцкага педінстытута Ала НАРАШЧУК і адзінаццацікласніца СШ № 26 Аксана МІХАЙРЫНА.

Фота Эдуарда КАБЯКА (БЕЛТА).

Трыццацігоддзе адзначыла нядаўна адзіная ў Беларусі рэспубліканская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву па коннаму спорту, што ў пасёлку Ратамка Мінскага раёна. Многія яе выхаванцы сталі вядомымі ў краіне і за мяжой спартсменамі, алімпійскімі чэмпіёнамі.

Сёння ў Ратамскай РСДЮШАР конным спортам займаецца больш за трыста чалавек. У зімовым манежы трэніруецца некалькі груп коннікаў рознага ўзросту і ўзроўню падрыхтоўкі.

НА ЗДЫМКУ: вельмі любіць свайго чацвераногага сябра Таня ХАЛІМАНЦЭВІЧ.

Фота Івана ЮДАША (БЕЛТА)

Уладзімір ГОЙТАН

Банда Мезіна

Міліцыянеру мужнасці не пазычаць. Як, зрэшты, і доблесці, адвагі. Гісторыя ведае тысячы прыкладаў, калі, рызыкуючы сабой, салдаты правапарадку прадухілялі бяду, спынялі ашалелых злачынцаў, здаралася, прыкрывалі сабой іншых. Але каб парушыць прысягу, самому стаць на злачынны шлях, арганізаваць банду? Адным словам, стаць пярэваратнем? Такое цяжка сабе ўявіць. І ўсё ж...

ШАНТАЖ

Рувім Рыўкін пад'ехаў да «Мерыдыяна», як звычайна, недзе гадзін у адзінаццаць вечара, калі вясёлая публіка пакідае рэстаран. Тут ён падбіраў пасажыраў і развозіў іх на сваім арандаваным таксі па ўказаных адрасах. Тыя, зразумела, разлічваліся шчодра—у горадзе добра ведалі прыватнага возніка, ды і ён абыкаго не падбіраў—была свая кліентура, часцей за ўсё іншаземцы. Тыя асабліва не таргаваліся.

Вось і цяпер у чаканні пасажыраў Рыўкін пакручваў у руцэ ключы ад машыны. Падышоў яшчэ адзін таксіст. Перакінуліся словам.

Раптам на поўным ходу за некалькі метраў ад іх, па-заліхвацку выпісаўшы паўкруг, спыніўся матацыкл. Чамусьці на «Яве» не было нумарных знакаў. Але на гэту акалічнасць спачатку ніхто не звярнуў увагі, як і на вадзіцеля, і на пасажыра, што сядзеў у яго за спінай. У абодвух звычайныя матацыклетныя шлемы з апушчанымі забраламі.

Матор «тачкі» працягваў працаваць. Тым часам пасажыр крыху мітусліва саскочыў на асфальт, агледзеўся і выхапіў з-пад крыса балоневай курткі нейкі прадаўгаваты прадмет.

Суха трэснуў стрэл. У шумным вэрхале, што панаваў наўкол, яго ніхто ўсур'ёз і не ўспрыняў. Але калі Рыўкін раптам асунуўся прама каля сваёй машыны, усе схамянуліся. Кінуліся да яго — і здранцвелі ад жаху: яго цела яшчэ працягвала торгацца, а з ранкі ў шыі струменіла кроў. Хтосьці зняў шапку.

Зароў матацыкл і, быццам застаялы рысак, ірвануў з месца. Крык, шум...

Раніцай у Жлобіне толькі і размоў было аб нападзе на прыватнага таксіста. Версій было шмат. У горадзе з'явіўся тэрарыст-маньяк, што забівае людзей,—гаварылі адны. Ды тут арудуе цэлая банда,—сцвярджалі другія. Маўляў, справа іх рук і забойства Валянціна Жамойды. Гэта смерць таксама вельмі ўсхвалявала жыхароў горада і раёна.

Прыкладна тыдні за два да апісанага вышэй здарэння ў ноч з 23 на 24 жніўня 1989 года пры загадкавых акалічнасцях на Малевіцкім возеры быў забіты жыхар Жлобіна В. Жамойда. Яго знайшлі побач з вагончыкам, дзе звычайна жылі кааператары, якія ўзялі возера ў арэнду. Насцярожвала, што ў абодвух выпадках выкарыстана агнястрэльная зброя, хутчэй за ўсё стралялі з малакаліберанай вінтоўкі або карабіна, да таго ж, абедзве ахвяры забіты ў шыю. Выпадковасць? Хутчэй заканамернасць, бандыцкі «почырк».

А неўзабаве жыхары Жлобіна пераканаліся, што ў горадзе арудуе сапраўдная банда. Ды і невядомыя злачынцы не вельмі ўтойвалі гэта. Па логіцы, учыніўшы адно злачынства, а тым больш—наўмыснае забойства, зламыснікі павінны былі стаіцца, залегчы на дно. А тут—усё наадварот.

Позна вечарам у кватэрах мясцовых кааператараў чуліся тэлефонныя званкі. Часцей за ўсё адзін і той жа грубы мужчынскі голас пагрозліва папярэджваў:

— Жамойда і Рыўкін, адмовіліся дзяліцца з намі сваімі даходамі. Спадзяюся, вы будзеце больш разумнымі. Інакш...

Трэба сказаць, гэта былі не пустыя пагрозы. Некалькі разоў падобныя званкі ўзрушвалі і сям'ю кааператара Дзмітрыя Фарберава. А калі ён адмовіўся плаціць даніну, хтосьці кінуў пад акно кватэры трацілавы зарад. Рэальна адчуваючы небяспеку, Фарбераў вымушаны быў разам з сям'ёй перабрацца ў Кіеў, а затым і зусім падацца за кардон.

Быццам кляшчы, упіліся невядомыя вымагальнікі ў Марата — сына забітага Рыўкіна. З цынічнай нахабнасцю ўсё той жа голас пастаянна нагадваў яму па тэлефоне, што на беразе Малевіцкага возера павінен быў замест Жамойды праглынуць кулю ён, Марат Рыўкін. І калі будзе такім жа незгаворлівым, як бацька, дык хутка пойдзе за ім следам. Давялося і Марату пакідаць родныя мясціны, шукаць прытулку ў іншых краях.

А тым часам сітуацыя ў Жлобіне працягвала ўскладняцца... Начныя званкі, бясконцыя пагрозы. А тут яшчэ розныя пагалоскі. Кожную раніцу горад прачынаўся ў чаканні новых жахлівых гісторый. Кагосьці абрабавалі ў цёмным завулку, пырнулі нажом у п'янай бойцы... І папаўзлі чуткі адна за другую страшнейшыя: не будзе ад бандытаў жыцця, чыя чарга наступная?

Патрэбны былі неардынарныя меры, каб вывесці горад з шокавага стану, спыніць паніку.

Следчы па асабліва важных справах пры пракурору рэспублікі Алег Іванавіч Дамурадаў прыбыў у Жлобін у разгар падзей. Яму і даручана было расследаванне справы аб забойстве Рувіма Рыўкіна.

Першая тоненькая папка з заявай жонкі пацярпеўшага, некалькімі нязначнымі дакументамі, якія маюць непасрэднае дачыненне да справы,—вось, бадай, і ўсё, з чаго пачынаў. Практычна з нуля.

Вядома, Алег Іванавіч ужо ведаў і пра забойства Жамойды, і пра шантаж кааператараў, прыватных прадпрымальнікаў. Аднак гэтыя падзеі яшчэ трэба было звязаць у адзіны ланцужок, і не проста логікай мыслення, але фактамі, доказамі, каб выявіць крыніцу зла. За гады работы ў пракуратуры следчаму неаднойчы даводзілася дзейнічаць разам з міліцыяй. І тут, натуральна, паспрабаваў звярнуцца за дапамогай да мясцовых кадраў. Веданне агульнага становішча, кантакты з насельніцтвам — гэта і многае іншае магло стаць неацэнным падмогай у арганізацыі пошукаў злачынцаў.

Аднак першая ж нарада ў гаррайаддзеле ўнутраных спраў насцярожыла. Літаральна на наступны дзень горад ведаў, што з Мінска прыбыў нейкі вельмі ўжо вопытны следчы, які, маўляў, умомант «раскруціць» усе тутэйшыя злачынствы. Называлі імя і прозвішча, пасаду. Але гэта яшчэ паўбяды. Сталі здабыткам грамадскасці падрабязнасці нарады, хоць яна і насіла службовы характар, бо распрацоўваліся толькі першыя версіі. Да таго ж, у нарадзе прымаў удзел афіцэрскі састаў, прысутныя былі строга папярэджаны— і на табе. Добра, калі хтосьці нейсцярожна ляпнуў лішняе. А калі...

Алег Іванавіч рэгулярна дакладваў па інстанцыі аб ходзе расследавання, аб цяжкасцях, праблемах. Натуральна, не змоўчаў і пра гэты прыкры выпадак. Наверсе і без таго былі вельмі занепакоены становішчам спраў у Жлобіне. Растрывожаныя жыхары сігналілі ва ўсе інстанцыі: дапамажыце навесці парадак у горадзе! А тут яшчэ такі сур'ёзны пракол.

І вось крыху больш чым праз месяц пасля пачатку расследавання ў Пракуратуры рэспублікі адбылася экстранная нарада з удзелам прадстаўнікоў усіх праваахоўных органаў, уключаючы і Камітэт дзяржбяспекі. Было прынята рашэнне стварыць спецыяльную групу высакакласных аператыўных работнікаў па расследаванню жлобінскіх спраў. Паколькі следчы па асабліва важных справах пры пракурору рэспублікі Алег Іванавіч Дамурадаў пачаў ужо над гэтым працаваць, яму і даручылі ўзначаліць групу. Акрамя яго, у састаў групы ўвайшлі старшы следчы Жлобінскай міжраённай пракуратуры Ірына Вячаславаўна Бондарава, следчы Слаўгарадскай раённай пракуратуры Міхаіл Іванавіч Клязовіч, па рашэнню Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі—начальнік аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю падпалкоўнік міліцыі Мікалай Сяргеевіч Губскі, а таксама вопытныя аператыўныя работнікі капітан Анатоль Якаўлевіч Казырыцкі, старшы оперупаўнаважаны Уладзімір Сцяпанавіч Заяц і оперупаўнаважаны гэтага ж аддзела Ігар Рыгоравіч Лымар. Непасрэдна з УУС Гомельскага аблвыканкома ў групу ўвялі начальніка ўпраўлення крымінальнага вышуку Сяргея Канстанцінавіча Ушака, начальніка аддзела па барацьбе з арганізаванай злачынасцю Міхалая Васільевіча Лосева, оперупаўнаважанага Уладзіміра Анатольевіча Козела і начальніка аддзела па раскрыццю злачынстваў супраць асобы Уладзіміра Ільіча Мельнікава. Акрамя таго, у групе былі два прадстаўнікі дзяржбяспекі — следчыя УКДБ па Гомельскай вобласці Аляксандр Ціханавіч Цукарэвіч і намеснік начальніка аддзела ўпраўлення Уладлен Якаўлевіч Сцепаненка.

Ужо на першай нарадзе хтосьці пажартаваў: не калектыў — чортаў тузін: у саставе групы 13 чалавек. Пажартавалі, пасмяяліся— і за работу. А яе і сапраўды — непачаты край. Размеркавалі абавязкі, абгаварылі версіі. Іх набралася шмат. Усе ўжо былі ў курсе той першай нарады, што праходзіла ў мясцовым гаррайаддзеле ўнутраных спраў. І хоць не было даных адносна крыніц уцечкі інфармацыі, выказаліся за тое, што ў мэтах перасцярогі такія нарады лепш за ўсё праводзіць або ў будынку аддзялення дзяржбяспекі, або ў міжрайпракуратуры. Як кажуць, беражонага і Бог беражэ.

Да прыезду аператыўнай групы крымінагенная сітуацыя ў горадзе крайне ўскладнілася. Шмат клопатаў было ад «кідал», ажывіліся валютчыкі: побач БМЗ, чужынцы—лафа для ўсялякага роду спрытнюг. Усяго некалькі дзён спатрэбілася вопытным работнікам вышуку, каб выйсці на след злачыннай шайкі «кідал», якую ўзначальваў Генадзь Козел. Да таго часу ашуканцы паспелі абабраць некалькі даверлівых прасцякоў, усунуўшы ім замест запаветных пачкаў грошай звычайныя папяровыя «лялькі». Верхавод атрымаў 5 гадоў, асуджаны былі і трое яго памагатых.

(Працяг будзе).

ГЭТА ЦІКАВА

Лекі ад СНІДа

Растучае ва ўсіх краінах з вільготным кліматам дрэва гуайява, якое славіцца сваімі духмянымі пладамі, можа стаць галоўнай крыніцай сыравіны для атрымання прэпарату, які абяцае збаўленне ад СНІДа. Аб гэтым паведамляе йаханесбургская газета «Стар» (ПАР).

Што ў «дыпламаце» дыпламата

За выкарыстанне дыпламатычнага багажу для незаконнага вывазу з Зімбабве рога насарога, што прымяняецца ва ўсходняй медыцыне для лячэння мужчынскай імпатэнцыі, у Харарэ затрыманы паўночнакарэйскі дыпламат Хван Дэй Сонг.

Раней па аналагічнаму абвінавачанню з Зімбабве, якая падтрымлівае цесныя адносіны з КНДР, быў выдвараны яго калега Пак Сі Енг, напомніла паўднёваафрыканская газета «Сітызен».

Аб карысці «шкоднай прывычкі»

Самы пажылы француз, жыхар Эльзаса Эміль Ларан адсвяткаваў сваё 107-годдзе. Ён на дзесяць гадоў маладзейшы за самую старую французжанку Жанну Кальман, аднак сярод мужчын утрымлівае ў краіне пальму першынства.

Ларан нарадзіўся і правёў усё сваё жыццё ў дэпартаменце Ніжні Рэйн, прысвяціўшы сябе вельмі незвычайнаму рамяству: быў кантралёрам якасці тытуневых вырабаў. Пасля выхаду на пенсію пасяліўся ў сваёй дачкі. Сакрэт яго доўгажыхарства, як лічаць спецыялісты, просты: эльзасец, па-першае, вядзе вельмі спакойнае жыццё, любіць працаваць у садку, якому ён прысвяціў усе свае доўгія пенсіённыя гады.

Да 105-гадовага ўзросту ён іншы раз дазваляў сабе выкурыць трубку. Цяпер з гэтым пакончана.

Нядаўна ў яго быў пералом шыйкі бядра, да таго ж, цяпер некалькі пагоршыўся зрок. З-за гэтага ён пазбавіўся задавальнення чытаць сваю любімую сатырычную газету «Канар Аншэне», якая карыстаецца папулярнасцю ў Францыі.

«Рагатыя» пад арыштам

Жывёлагадоўчыя двары нагадваюць у гэтыя дні многія паліцэйскія ўчасткі ў горадзе Дабола ў цэнтры Гвінеі. Як паведаміла гвінейскае агенцтва друку (АГД), у выніку паспяхова праведзенай аперацыі паліцыя арыштавала паблізу адміністрацыйнай акругі Дабола больш як 300 безнаглядных кароў і бычкоў. Асновай для арышту рагуль паслужылі шматлікія звароты гарадской інтэлігенцыі да ўлад са скаргамі на іх «свавольствы».

З надыходам сухога сезона ўладальнікам цяжка стала пракарміць рагатых, і іх пачалі выпускаць адразу пасля ранішняга даення на вуліцу для самастойнага пошуку падножнага корму. Сотні кароў, авечак, коз і аслоў, якія мірна пасвяцца на гарадскіх вуліцах і плошчах, ствараюць сур'ёзныя перашкоды руху аўтатранспарту, забруджваюць мясцовасць.

(Па матэрыялах друку).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

15 студзеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Дзівосныя азёры». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 9 клас.
9.30. Ліра.
10.45. «Баграціён». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.30. Экран дзіцячага фільма. «Маленькая чараўніца».
17.40. «Ліса, мядзведзь і мужык», «Муравейка Ціпа». Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы.
18.15. Подых палескай нівы. Пра справы меліяратараў трэста «Брэстводбуд».
18.55. Наш каментарый. «Страсці па купонах».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны.
19.35. Сустрэча са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. Шушкевічам. Прамая лінія.
20.25. Калыханка.
20.45. «Шукай саюзнікаў у прыродзе». «Каралі галубкі». Дак. фільмы.
21.30. Біржавыя навіны.
21.35. НІКа.
21.50. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Першая праграма

6.00. Раніца.
8.35. Мультфільмы.
9.10. Дзіцячы музычны клуб.
9.50. Разам з чэмпіёнамі.
10.05. Маст. фільм «Іржа». 2-я серыя.
11.00. Дак. фільм «Вывай, зброя».
11.30. Канцэрт рускага народнага аркестра «Малахіт» г. Чэлябінска.
12.00. Навіны (з сурдаперакладам).
12.20. «Як дабіцца поспеху». Перадача 2-я.
12.35. Навукова-папулярны фільм «Народныя лекары».
13.05. Спорт для ўсіх.
13.40. «Хто як можа». Пра эстонскага мастака П. Мудзіста (Талін).
14.15. Тэлемікст.
15.00. Навіны.
15.20. «Сёння і тады».
15.50. «Пяшчотнасць да раўчага звера». Маст. фільм. 2-я серыя.
17.00. «Хто ж мы, немцы Сібіры ў 1990 годзе?» (Германія).
18.00. Навіны.
18.20. II Усесаюзны фестываль тэлепраграм для дзяцей і юнацтва. «Вясёлка надзей» (Мурманск).
18.50. Па законах рынку.
19.30. Шоу-праграма бальных танцаў.
19.45. Маст. фільм «Іржа». 2-я серыя.
20.45. Добрай ночы, малышы!
21.00. Навіны.
21.35. «Лінія лёсу». Пра лёсы выдатных спартсменаў, якія пакінулі вялікі спорт.
22.30. Парадыз-кактэйль.
24.00. Навіны.
0.20. Міжнародныя спаборніцтвы па більярду.
0.45. «Пяшчотнасць да раўчага звера». Маст. фільм. 2-я серыя.

Расійскі канал

8.00. Весткі.
8.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час. «Дамашні клуб».
9.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
9.35. Канцэрт аўтарскай песні.
10.15. Фільмы К. Поднікса. «Мы». Частка 3-я.
11.10. Жыццё і смерць В. Мандэльштама.
12.10. Сялянскае пытанне. «Нялёгкі чалавек».
12.30. Н. Садур. «Панначка». Спектакль.
14.00. Весткі.
16.00. «Кантакт». Пяць карцін Э. Бялоціна.
16.30. Школа менеджэраў.
17.00. Тэлеагляд «Далёкі Усход».
17.45. Т. Ін. Ка.
18.00. Кубак свету па плаванню.
18.40. «Ад агульнага да прыватнага». Аб праблемах прыватызацыі ў Расіі.
19.00. «Вытрымкі мінулых нязздзейсненых дзён...» Паэты І. Кардаў і М. Кабакоў.
19.40. Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
20.00. Весткі.
20.20. Свята кожны дзень.
20.30. Тварам да Расіі.
20.50. «А што ў кошыку?» Дак. фільм.
21.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі.
21.30. «Адзідас». Знаёмы незнаёмец.
22.00. Студыя «Нотабене».
23.00. Весткі.
23.20. «Другі ці шаснаццаты».

16 студзеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Жыццё ў танцы». Музычны фільм.
9.50. «Пасляслоўе». Маст. фільм.
11.25. «Дзень цыркавога артыста». Тэлефільм.
16.30. Беларуская літаратура. 9 клас.
17.00. Канцэрт выхаванцаў і настаўнікаў школ рэспублікі, прысвечаны 100-годдзю Р. Р. Шырмы.
17.50. «Дзівосны манеж». Мультфільм.
18.00. Дак. фільмы «Элегія». «Званы памяці».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. Факты і меркаванні. Беларуская палітыка.
20.25. Калыханка.
20.45. Тыдзень Беларускага ўрада. Служба інфармацыі Савета Міністраў Беларусі паведамляе...
21.00. «Купалінка». Фільм-канцэрт.
21.35. НІКа.
21.50. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Першая праграма

6.00. Раніца.
8.35. Фільм — дзецям. «Прыгоды ў горадзе, якога няма».
10.00. Мультфільмы.
10.35. Мастацкі фільм «Іржа». 3-я серыя.
11.35. Дак. фільм «Коля модны».
12.00. Навіны (з сурдаперакладам).
12.20. Чалавек і закон.
13.00. «Пад знакам «пі».
13.50. «Таму і любыя мне людзі». Музычная кампазіцыя на вершы С. Ясеніна.
14.15. Тэлемікст.
15.00. Навіны.
15.20. «Клоуны». Фільм-канцэрт.
15.30. «Пяшчотнасць да раўчага звера». Маст. фільм. 3-я серыя.
16.55. II Усесаюзны фестываль тэлепраграм для дзяцей і юнацтва. «Лета ў кошыку» (Коміі).
17.15. Фільм — дзецям. «Клоун Ларэці і ўсмешка».
18.00. Навіны.
18.20. ...Да 16 і старэйшым.
19.00. Мультфільм «Мы ідзём шукаць».
19.10. Краіна туманаў, аэр і традыцый (Шатландыя).
19.45. Маст. фільм «Іржа». 3-я серыя.
20.45. Добрай ночы, малышы!
21.00. Навіны.
21.35. Запрашэнне да музыкі.
23.05. «Крымінформ» паведамляе.
23.20. «З Лондана з любоўю, ці Непадарожныя нататкі». Перадача 2-я.
24.00. Навіны.
0.20. Аўтаралі Парыж — Трыпалі — Кейптаун.
1.00. «Пяшчотнасць да раўчага звера». Маст. фільм. 3-я серыя.

Расійскі канал

6.00. Весткі.
8.20. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час. «Калекцыянер».
9.05. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
9.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
10.35. Фільмы Ю. Поднікса. «Мы». Частка 4-я.
11.30. «У пошуках жанру». Л. Філатаў.
13.05. «Наш стары універсітэт». Тэленарыс.
13.40. 15 хвілін па «новаму часу».
14.00. Весткі.
16.00. М. Арцыбашаў. «Ворагі». Тэлеспектакль.
17.45. Т. Ін. Ка.
18.00. Грані.
18.45. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Рэформа для цябе.
19.40. Вольны час. «Увага, здымаю!»
20.00. Весткі.
20.20. Свята кожны дзень.
20.30. СКВ.
20.40. Маст. фільм «Санта-Барбара». 9-я серыя.
21.30. На сесіі Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі.
21.55. Пятае кола.
23.00. Весткі.
23.25. Пятае кола (працяг).

РАДЫЁ

16 студзеня

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 10.00, 15.00, 20.00, 23.00.

7.00 — «Радыёфакт». Раніцняя інфармацыйная праграма. 8.15 — «Вясковыя росталі». 9.15 — «Фрэскі Пагарыння». Нататкі У. Глушакова. 9.45 — новыя песні Б. Раінчыка. 10.15 —«Званочак». Праграма для маленькіх. 11.15 — «Старонкі класічнай музыкі». 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». Інфармацыйна-музычная праграма. 14.00 — «Ваша думка, ваша прапанова». 15.15 — «Наш студзеньскі каляндар». Літаратурна-публіцыстычная перадача. 15.30 — «Восеньскі гром». Нататкі. 15.50 — вершы А. Вялюгіна. 16.05 — «Рамантыкі». 17.00 — У. Дарохін. Сімфонія № 3. «Ф. Скарына. Жыццё і неўміручасць». 17.40 — «Ад нашага ўласнага карэспандэнта». 18.00 —перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — вячэрняя казка. 20.00— «Дзень нашага жыцця». 20.25— канцэрт Н. Кастэнкі і М. Жылюка. 21.00 — «Ад шчырага сэрца». Музычная праграма па пісьмах радыёслухачоў. 22.00— «Дабрыня». Публіцыстычная праграма. 22.30 — канцэрт. 23.10 — канцэртная праграма з удзелам зорак зарубежнай эстрады.

НА ДВОР'Е

15 студзеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае надвор'е, часам ападкі, пераважна снег, месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ў Гродна і Брэсце — 1—3 градусы цепла, у Мінску — каля 0, у Гомелі і Віцебску — 0 — мінус 2, Магілёве — 1—3 градусы марозу.

У наступныя двое сутак часам снег, мокры снег, слабая мяцеліца. Тэмпература паветра ўначы 1—6 градусаў марозу, удзень ад 2-х марозу да 3-х цепла. 17 студзеня на працягу сутак 0—5 градусаў марозу.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Пасланне сінода Беларускага экзархата напярэдадні стагоддзя Праваслаўнай Царквы ў Беларусі.

Пра дадатковую выдачу купонаў. Тлумачэнні і дапаўненні. Інфармблок.

Яшчэ раз пра мафію. Дзейнічае ці не «савецкая мафія» ў Польшчы?

Канцэпцыя рэформы аплаты працы ў народнай гаспадарцы Рэспублікі Беларусь. (Друкуецца са скарачэннем).

Бюро даведак.

Кругагляд. У ім артыкулы: «Кардынал Рауль Сільва: рускі народ вялікі ў сваёй велічы», «Еўрапейцы ўсвядомілі, што ў адзінстве сіла», «Хворыя лёгкія Дэлі».

ПРЫВАТНЫЯ АБ'ЯВЫ

ПРАДАЕЦЦА

драўляны дом у г. п. Плешчаніцы Мінскай вобласці. Ёсць агарод, надворныя пабудовы. Звяртацца 18, 19 студзеня: Лагойскі раён, г. п. Плешчаніцы, вул. Кастрычніцкая, 45.

МЯНЯЮ

дыван 1.37х2, дывановую дарожку 2х4 на халадзільнік ці ТЦ.

Тэл. у Мінску 55-67-32.